№ 41 (687) 3 лістапада 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Падлодка «Курск» у беларускім стылі**

Старонка 2



**«Беларусы маюць байцоўскі ген»**

Старонка 13

**Як гэта па-нашаму?**

Старонка 15





**4 лістапада ў Мінску адбудзецца раскошны канцэрт. Старонка 6.**

# Мільён Лукашэнкі і мільён апазіцыі

Выбары–2010: кандыдаты здалі подпісы.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Найбольш подпісаў сабралі Уладзімір Някляеў (справа) і Андрэй Саннікаў.**

## У НУМАРЫ

**Машына-месца ў Мінску каштуе амаль як аднапакаёўка**

За пару квадратаў паркоўкі просяць $30 тысяч. **Старонка 4.**

**За эканамічныя злачынствы не арыштуюць**

да рашэння суда. **Старонка 10.**

**Ганчарэнка з'едзе ў Маскву?**

Трэнер БАТЭ адказаў на пытанні «Нашай Нівы». **Старонка 6.**

**Ахвяра псіхіятрычных Курапат**

Пісьменнік Алесь Наўроцкі: адны яго даўно пахавалі, а для іншых ён застаецца загадкай. **Старонка 11.**

**Гісторыя Беларусі. Вяртанне дынастыі**

Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 12.**

## Выбар-2010

• Еўропа абяцае тры мільярды еўра ў абмен за свабодныя выбары. **Старонка 3.**

Някляеў хоча стаць больш рускім за Лукашэнку. **Старонка 2.**

• Кандыдат Правальскі сабраў амаль усе подпісы ў адным раёне Віцебска. Ну, не ўсе. Тысячу сабраў у іншых. **Старонка 8.**

• Андрэй Саннікаў: Я б хацеў перш даведацца, хто сапраўды набраў 100 тысяч.

• БТ гаворыць пра Лукашэнку ў 1250 разоў болей, чым пра апазіцыю. Маніторынг «Асвятленне прэзідэнцкіх выбараў-2010 у беларускіх СМІ». **Старонка 9.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

Ярмошына: Язык не паварочваецца сказаць «сабралі подпісы».

А паказанні Мікалая Казлова старшыня ЦВК называе «старой правакацыяй». **Старонка 8.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Ярмошыну злавілі на хлусні

## Улады баяцца тэледэбатаў?

Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына заявіла на прэс-канферэнцыі 1 лістапада, што пакуль «ніхто з кандыдатаў і прадстаўнікоў штабоў не выказваў адкрыта прэтэнзій наконт формы правядзення тэлевізійных дэбатаў».

Нагадаем, іх плануецца паказваць у запісе. Па словах Лідзіі Ярмошынай, БТ прасцей праводзіць дэбаты ў такой форме.

«НН» пацікавілася ў кіраўнікоў ініцыятыўных груп некаторых кандыдатаў, ці насамрэч яны згодныя з правядзеннем дэбатаў у запісе. Аказалася, што гэта зусім не так.

Аляксей Янукевіч, кіраўнік перадвыбарчага штаба Рыгора Кастусёва, сказаў «Нашай Ніве», што «запіс дэбатаў — гэта смешная прапанова». «Мы неаднаразова заяўлялі публічна, што дэбаты трэба праводзіць у жывым эфіры. Запіс дэбатаў — гэта рэжысура неабходнай карцінкі», — думае спадар Янукевіч.

Такой думкі трымаецца і кіраўнік ініцыятыўнай групы кандыдата ад БХД Павел Севярынец: «Запіс — гэта цырк. Мы разглядаем магчымасць удзелу ў дэбатах толькі ў тым выпадку, калі гэта будуць дэбаты ў жывым эфіры, з удзелам Лукашэнкі. Я ведаю, якімі метадамі працуе БТ. Маю цэлую калекцыю фільмаў аб сабе, зробленых на гэтым канале». П.Севярынец таксама зазначыў, што пісанне заяваў у ЦВК — пустое марнаванне часу. Але «калі мы трапім на пасяджэнне ЦВК, то абавязкова будзем гаварыць аб неабходнасці правядзення дэбатаў у жывым эфіры», — кажа Севярынец.

У штабе Уладзіміра Някляева заява Лідзіі Ярмошынай выклікала смех. Кіраўнік ініцыятыўнай групы Някляева Андрэй Дзмітрыеў асабіста заяўляў Ярмошынай аб неабходнасці правядзення дэбатаў ужывую: «Мы патрабавалі гэтага падчас разгляду скаргі на нашу ініцыятыўную групу. Лічым, што можна браць удзел толькі ў жывых дэбатах. Калі гэта будзе запіс, то сэнсу ў іх няма».

Не бачыць сэнсу ў правядзенні тэледэбатаў у запісе і прэс-сакратар Андрэя Саннікава Аляксандр Атрошчанкаў. «Вядома, мы выступаем за правядзенне дэбатаў у жывым эфіры», — заявіў Атрошчанкаў.

**Алесь Пілецкі**

# Пінская трагедыя: многіх не ўратавалі

Колькасць ахвяр на «Пінскдрэве–ДСП» вырасла да 14 чалавек.

Такія звесткі падаў Пінскі райвыканкам па стане на 1 лістапада. Паводле папярэдняй інфармацыі, 25 кастрычніка прыблізна ў 13:05 на «Пінскдрэве» прагрымелі два выбухі. Першы прагрымеў на лініі па вытворчасці пелетаў, другі ў цэху ДСП.

Там у момант выбуху было 20 чалавек. 14 з іх загінулі (два чалавекі — на месцы), 6 у цяжкім стане знаходзяцца ў бальніцах: 3 чалавекі ў Брэсцкай абласной бальніцы, 3 — у бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі ў Мінску. Па словах кіраўніцтва прадпрыемства, яшчэ 9 чалавек былі ў цэху за лічаныя хвіліны да трагедыі, але выйшлі хто ў курылку, хто ў прыбіральню. Усяго ў тую працоўную змену павінна было працаваць 48 чалавек. Гэта папярэднія звесткі, дакладная колькасць супрацоўнікаў, што былі на месцы здарэння, удакладняецца.

Па заяве кіраўніцтва «Пінскдрэва», выплаты сем'ям загінуўшых ў цэлым складуць па 100 млн рублёў, а пацярпелым — па 50 млн.

### Лукашэнка ў Пінск не заехаў і жалобы не аб'явіў.

Узрост ахвяр выбуху на «Пінскдрэве» сягае ад 23 да 60. Сярод ахвяраў — маладая жанчына, 1986 г.н. Яе пахавалі на радзіме ў вёсцы Хомск Драгічынскага раёна.

### Праўда толькі ў нас

Услед за трагедыяй па Пінску пайшлі чуткі пра тое, што ахвяраў выбуху нашмат больш, чым падаецца афіцыйна.

Непацверджаныя звесткі пачалі шырыцца за межы гарадскіх сайтаў. Паведамлялася, што сродкі, сабраныя на дабрачынным суботніку, пойдуць не на дапамогу сем'ям ахвяраў, а на святкаванне 130-годдзя фабрыкі.

Кіраўніцтва райвыканкама і «Пінскдрэва» адрэагавала на некантраляваны паток інфармацыі жорсткай заявай. «У інтэрнэт-крыніцах і на тэлебачанні праходзіць множства перакручанай інфармацыі аб аварыі на СТАА «Пінскдрэў — ДСП», якая не адпавядае рэчаіснасці. Дакладныя звесткі пра здарэнне і стан спраў штодня абнаўляюцца на афіцыйным сайце кампаніі «Пінскдрэў», Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў ім. прафесара М.З.Куняўскага і канцэрна «Беллеспаперапрам». Таму праўду можна даведацца толькі з гэтых крыніц. Астатняя ж інфармацыя ў інтэрнэт-крыніцах і некаторых СМІ з'яўляецца чорным піярам і спекуляцыяй на чалавечай і нашай калектыўнай бядзе.

Ад непасрэдных сведак трагедыі паступае скупая інфармацыя. Стала вядома пра шчаслівае ўратаванне 55-гадовай Таццяны Маўчун, якая трапіла ў эпіцэнтр выбуху. Жанчыну выратавалі сцены бытоўкі.

Працяг на старонцы 5.




На трасе Мінск — Гродна за 10 км ад Шчучына згарэў турыстычны аўтобус Mercedes-Benz. Ён сутыкнуўся з цягачом Volvo з паўпрычэпам. Трое з сарака пасажыраў трапілі ў шпіталь.

КАМЕНТАР

## Някляеў хоча стаць больш рускім за Лукашэнку

Ягоная эканамічная праграма горшая за лукашэнкаўскую. Піша **Андрэй Дынько**.

«Расійскі капітал павінен скупляць тут тое, што і так, па сутнасці, залежыць ад Расіі. І што, па вялікім рахунку, акрамя Расіі, нікому не трэба», — заявіў Уладзімір Някляеў, прэзентуючы сваю замежнапалітычную платформу. У якасці прыкладу ён прывёў нафтаправоды, якія, паводле яго слоў, патрабуюць «капітальнага рамонту, на які ў Беларусі няма грошай». Ён таксама ўзгадаў «тыя ж нафтаперапрацоўчыя заводы, якія працуюць на расійскай сыравіне. Калі расійскія кампаніі ўвойдуць туды як уласнікі, то з імі можна будзе лягчэй весці перамовы, лягчэй вырашаць пытанні, якія на сённяшні дзень не вырашаюцца», — адзначыў Някляеў.

Працяг на старонцы 7.

## Беларусь жыве не па сродках

Дэфіцыт замежнага гандлю дасягнуў 6 млрд даляраў за 9 месяцаў.

За 9 месяцаў года Беларусь купіла за мяжой на 5 млрд 982,6 млн долараў больш, чым прадала за мяжу. Гэта амаль на мільярд болей, чым за той жа перыяд 2009 года.

У студзені—верасні гэтага года аб'ём замежнага гандлю таварамі павялічыўся на 17,1% у параўнанні са студзенем—вераснем 2009-га і склаў $41,1 млрд. Экспарт за гэты перыяд павялічыўся на 16,8% і склаў $17,5 млрд долараў, імпарт — на 17,3%, да $23,5 млрд.

Як вынік, у Беларусі нарастае дэфіцыт валюты.

**Сяргей Гезгала**

### Самае чытанае на nn.by за 27 кастрычніка — 2 лістапада

- Дзяды–2010
- Ярмошына: У мяне язык не паварочваецца сказаць «сабралі подпісы»
- Свята дэмакратыі пакуль працягваецца
- Някляеў хоча стаць больш рускім за Лукашэнку
- Беларусы маюць выключны байцоўскі ген
- Пераможцай конкурсу «Міс свету — 2010» стала дзяўчына з ЗША
- Лукашэнка: Дзень народзінаў — самы паршывы дзень у годзе
- Чаго мужчына хоча ў ложку?
- У СССР сэкс быў!
- Акадэмія навук: Беларусы — ніякія не балты і схільныя да глухаты

### Сцісла

**• Беларусь павялічыць стаўку на транзіт расійскага газу на 6%.** Пра гэта заявіў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка. Штогадовы аб'ём прапампоўвання прыроднага газу праз Беларусь складае 43—44 млрд кубаметраў. Сёлета тарыф складае 1,88 даляра за 1 тыс. куб. м на 100 км. У 2011 годзе будзе 2 даляры. Будзе мяняцца тарыфная палітыка і ў дачыненні да транзіту нафты: Беларусь чакае падзення аб'ёмаў прапампоўвання нафты ў сувязі з запланаваным на 1 студзеня 2011 года запускам нафтаправода БТС-2.

**• Восень кажа апошняе «бывай».** 3—4 лістапада па краіне чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, месцамі дажджы. Вецер паўднёва-заходні 6—11 м/с, днём парывы да 14 м/с. Тэмпература паветра ноччу плюсавая, днём 7—14°С.

**• У Мінску будзе аквапарк.** Праект зацвердзіў урад. Аквапарк будзе пабудаваны па праспекце Пераможцаў ля вадасховішча «Дразды». Кошт будаўніцтва складзе каля $80 млн. Аб'ект будуць узводзіць за сродкі гарадскога бюджэту з прыцягненнем крэдытаў. Ужо афармлены крэдыт у адным з беларускіх банкаў. Летам за адзін дзень аквапарк змогуць наведаць да 4,4 тыс. чалавек, зімой — да 3,4 тыс. Збудаваць яго плануюць да 2012 года.

**• Зробім наступны год Годам роднай мовы.** З такім заклікам да кіраўніка дзяржавы звярнулася Таварыства беларускай мовы.

**• Нахабны пляменнік вынес рэчы з кватэры цёткі.** Распачатая крымінальная справа супраць 22-гадовага мінчука, раней судзімага за незаконны абарот наркотыкаў. Паабяцаўшы сваёй цётцы дапамагчы з рамонтам акна на балконе, ён вынес з яе кватэры пральную машыну, кухонную пліту і люстры ад шафы-купэ.

**• У Бешанковічах спілавалі 400-гадовы дуб.** Чаму? «Пагражаў падзеннем на школьнікаў». Дрэва называлі «Дубам Напалеона», у Бешанковічах над Дзвіной захаваўся харошы пейзажны парк. Абгарадзіць дрэва, дагледзець не хапіла розуму.

**СМ**

### nn@nn.by

Дзякуй спадару Міколу Яўмененку з Чудзенічаў (Лагойскі раён) за смачную садавіну, якую ён цэлае лета прывозіў нашаніўцам.

Вельмі дзякуем Міколу Раманаву (Антверпен) за тыя шматлікія сувеніры і падарункі, якія ён прывёз нашаніўцам з Бельгіі.


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

**Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»:** для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Д.М., Уладзіміру Г., І.М., Сяргею М., Л.Ш., А.Р. з Мінска.
Зміцеру П. з Мінскага раёна.
Т.К. са Смалявіцкага раёна.
Святлане Ш., Уладзіславу Г. з Віцебска.
М.Б. з Полацка.
А.С. з Мазырскага раёна.
Лілі Л. з Маладзечанскага раёна.
Міхалу К. з Рэчыцкага раёна.
Аксане Д. з Пінскага раёна.
П.К. з Мастоўскага раёна.
А.П. з Брэста.

# Паверылі на слова

**Міністры замежных справаў Германіі і Польшчы Гіда Вэстэрвэле і Радаслаў Сікорскі паабяцалі Лукашэнку 3 мільярды еўра ў выпадку справядлівых выбараў.**

2 лістапада Мінск наведалі адразу два кіраўнікі МЗС краінаў Еўрасаюза. Было відавочна, што Вэстэрвэле і Сікорскі прыехалі ў Беларусь, каб давесці пазіцыю ЕС адносна выбараў. Чаканні пацвердзіліся.

З міністрамі прыехаў свет журналістаў — што нямецкіх, што польскіх. Значыць, у гэтых краінах візіт разглядаюць як важны.

«Калі Лукашэнка правядзе сумленныя выбары, Беларусь можа атрымаць ад ЕС 3 млрд еўра», — у лоб заявіў міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі.

На чым грунтуюцца такія разлікі? Сікорскі адзначыў, што яны базуюцца на той дапамозе, якую Еўрасаюз аказвае Малдове. Цягам двух гадоў гэтая постсавецкая краіна мусіць атрымаць 2 мільярды еўра. «А паколькі Беларусь большая краіна, то і дапамога мусіць быць большай», — зазначыў польскі дыпламат.

Крыніцамі атрымання гэтых фінансаў могуць быць Міжнародны валютны фонд, Еўрапейскі інвестыцыйны банк, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця, макракрэдыты. Не абмінуў Сікорскі магчымасці нагадаць, што папярэднія крэдыты былі выдзеленыя Беларусі, калі Еўрапейскім дэпартаментам МВФ кіраваў паляк Марэк Бэлька. Гіда Вэстэрвэле канкрэтную лічбу называць не спяшаўся, але пагадзіўся, што дапамога будзе.

«Гаворка пра якасць, а не вынік выбараў», — акцэнтаваў увагу Сікорскі. Гэтыя словы паўтараліся ўвесь час.

«Прэзідэнт Беларусі нам сёння клятвенна паабяцаў, што выбары пройдуць сумленна. Мы паверылі яму на слова», — заявіў кіраўнік польскага замежнапалітычнага ведамства.

Лукашэнка ж публічна заняў тую ж пазіцыю, што і на нядаўняй сустрэчы з прэзідэнткай Літвы Даляй Грыбаўскайце. Маўляў, і раней ніякіх парушэнняў не было — не будзе і на гэты раз. «Ніколі ў нашай краіне не было, каб парламент і прэзідэнта выбіралі недэмакратычна, — запэўніў ён. — Гэтыя выбары будуць дэмакратычнымі, бо вы гэтага хочаце».

А ці гатовы Лукашэнка сапраўды да выканання такіх абавязкаў? «Па пладах іх пазнаеце іх», — цытатай з Бібліі адказаў нямецкі міністр.

Сікорскі таксама зазначыў, што сёння прыняў палітычнае рашэнне адклікаць вета на ўдзел Беларусі ў «Паўночным супрацоўніцтве» Еўрасаюза.

«Мост у Еўропу стаіць на трох апорах: дэмакратыя, правы чалавека і свабодныя выбары. Для Беларусі ў Еўропу — адзін шлях, і ён вядзе праз справядлівыя выбары», — лічыць Вэстэрвеле.

Цікавіліся журналісты, ці абмяркоўвалася эканамічнае супрацоўніцтва. Але міністры адказалі, што мэта візіту была трохі іншай, а эканамічнае паляпшэнне таксама будзе ў выпадку дэмакратычных выбараў.

Вядома, што Радаслаў Сікорскі вёў перамовы наконт польскай меншасці ў Беларусі, спыненне рэпрэсій супраць іх. Факт перамоваў быў пацверджаны, але ці прыйшлі бакі да якой згоды, не паведамлялася.

Міністры дэманстратыўна сустрэліся і з апазіцыйнымі кандыдатамі ў прэзідэнты. На сустрэчу ў гатэль «Еўропа» былі запрошаныя сямёра дэмакратычных прэтэндэнтаў і Аляксандр Мілінкевіч.




**Усе задаволеныя. Міністры Вэстэрвэле, Мартынаў, Сікорскі.**

«Самае галоўнае, што мы не засталіся адны ў такіх складаных умовах, што склаліся апошнім часам. Няясная цяпер пазіцыя Расіі, хоць зусім нядаўна яна была абсалютна зразумелай. Падтрымка Еўропы вельмі важная», — сказаў па сустрэчы лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў.

«Гэтыя краіны не першы год назіраюць за сітуацыяй у Беларусі. Мы зазначылі, што нельга верыць абяцанням, бо тое, што адбываецца, супярэчыць ім. Я ўзняў пытанне, ці можа Ярмошына ўзначальваць ЦВК», — зазначыў каардынатар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў.

Можна сказаць, што амаль усе ад візіту засталіся задаволенымі. Еўрапейскія міністры пачулі абяцанне справядлівых выбараў, Лукашэнка — аб магчымасці прызнання, апазіцыя — аб далейшай падтрымцы. Зрэшты, пакуль усе абяцанні трымаюцца толькі на слове.

**Зміцер Панкавец**




# Перадвыбарныя «Дзяды» ў Курапатах

Традыцыйнае шэсце памяці ў Курапаты прыпала на разгар выбарчай кампаніі.

Сярод мноства сцягоў большасць складалі нацыянальныя бел-чырвона-белыя. Аднак былі і створаныя на іх аснове партыйныя штандары Хрысціянскай Дэмакратыі і Партыі БНФ, а таксама «Маладога Фронту», «Маладой Беларусі», Еўрасаюза, пад якімі прыйшлі прыхільнікі Андрэя Саннікава.

Пэўны час удзельнічалі ў шэсці і самі патэнцыйныя кандыдаты: Андрэй Саннікаў, Мікола Статкевіч, Віталь Рымашэўскі, Рыгор Кастусёў. Лідар кампаніі «Гавары праўду!» Уладзімір Някляеў з'явіўся толькі на мітынгу ў Курапатах.

Блізкасць выбараў адчувалася ў паветры. Большасць размоваў удзельнікаў датычыла менавіта выбарчай тэматыкі. Людзі абмяркоўвалі магчымасць вылучэння адзінага кандыдата ад апазіцыі на выбарах і ўвогуле мэтазгоднасць удзелу ў іх.

Абмяркоўвалі людзі і палітызацыю шэсця. «Мне асабіста не падабаецца выпячванне сваіх партый падчас жалобнага шэсця, — сказаў нам удзельнік шэсця Сяргей. — Тут я бачу адно жаданне заявіць аб сваёй прысутнасці».

Зрэшты, пасля паловы шляху кандыдаты ад калоны адсталі. Надвор'е спрыяла, і да Курапатаў дайшло каля 700 чалавек. Не ўсе слухалі мітынг, арганізаваны кіраўніцтвам Кансерватыўна-хрысціянскай партыі БНФ, — людзі проста разыходзіліся па ўрочышчы, каб паставіць знічкі.

На мітынгу ж таксама не абышлося без выбараў. Валер Буйвал, адзін з арганізатараў шэсця, зачытаў зварот Зянона Пазняка, у якім гучалі заклікі ігнараваць прэзідэнцкія выбары праз іх недэмакратычнасць.

Людзі разышліся па ўрочышчы ставіць новыя крыжы, парадкаваць старыя.

**Алесь Пілецкі**

**«Ультранацыяналісты напалі на Саннікава»**

Навіна пад такім загалоўкам з'явілася на сайце Charter97.org. А ў чым напад? У часе шэсця ў Курапаты да кандыдата ў прэзідэнты падскочыў малады чалавек са сцягам і назваў яго прарасійскім. Аднак зуха адкінуў адным ударам спадарожнік Саннікава — малады чалавек моцнага целаскладу.

Загаловак charter97.org умомант стаў хітом белнэту.

«НН» не ўдалося атрымаць каментароў аб інцыдэнце ні ў штабе Саннікава, ні ў КХП–БНФ.

## Сцісла

**• У Магілёве ніводзін незалежны вылучэнец не трапіў ва ўчастковыя выбарчыя камісіі.** Пра гэта стала вядома з крыніц у кампаніі «За справядлівыя выбары».

**• Зюганаў у Мінску.** Кіраўнік Камуністычнай партыі Расіі Генадзій Зюганаў наведаў Мінск 28 кастрычніка. Ён сустрэўся з Аляксандрам Лукашэнкам і беларускімі дэпутатамі-камуністамі. Зюганаў актыўна крытыкуе сённяшніх крамлёўскіх кіраўнікоў.

**• Праверка па справе Бябеніна будзе працягнута яшчэ на месяц.** Пра гэта паведаміла старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна Калініна.

**• БХК — 15 гадоў.** На працягу гэтага часу прадстаўнікі Беларускага Хельсінскага камітэту адстойвалі інтарэсы і абаранялі правы грамадзян.

**ЗП**

## ВОДГУКІ

### Дзякуй за артыкул «Краіна, дзе час спыніўся» (№40)

**Канечне, Вам не па душы А.Су償раў на асігнацыях, але многім людзям у нас гэта падабаецца.** Наўрад ці Вы любіце Расію, як любяць яе трансністрыйцы ці як любіў яе У.Някляеў раней, ці як люблю яе я, Выш чытач.

Ціраспаль ніяк не падобны да Вілейкі альбо Шклова — тут Вы загнулі. Па-першае, насельніцтва ў 140 тысяч. Па-другое, Ціраспаль — гэта поўдзень, сады, вінаграднікі і любімы намі каньяк «Квінт». Па-трэцяе, там ёсць універсітэт, тэатры, выдаецца не адна газета.

Ціраспаль — гэта няслабая каманда «Шэрыф», нарэшце.

Можна не любіць іх лідара Смірнова, але ніяк нельга любіць Гімпу. Спадзяюся, што ён праваліцца на выбарах. Тады да Трансністрыі далучыцца Гагаузія са сталіцай у Камраце. Захад ніколі не прызнае Прыднястроўя (як ён прызнаў Косава). Галоўнае, каб прызнанне было з боку Расіі і Украіны. Беларусь таксама не прызнае. Як Вы думаеце, ці варта нам прызнаваць Косава?

**Рыгор Пятроўскі, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск. e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Дэнамінацыя ўжо блізкая?

**Касіры банкаў скардзяцца, што ў краіне абмяжоўваецца абарот 10- і 20-рублёвых купюр.**

Хоць дзесяцірублёвая купюра застаецца законным білетам Нацбанка, большасць беларусаў яе ўжо не ўспрымае як вартыя грошы. Шмат хто не чакае рэшты, калі яна складае 10 ці 20 рублёў, бо за іх нічога нельга купіць. Але выглядае на тое, што дробныя банкноты становяцца дэфіцытнымі — з такой праблемай сутыкнуліся сталічныя банкі.

### Са стосам грошай у кішэні

Пра такую сітуацыю карэспандэнту «НН» расказаў супрацоўнік аднаго з аддзяленняў «Беларусбанка» на праспекце Машэрава ў Мінску. «Час ад часу кожнае аддзяленне банка замаўляе ў галаўным офісе новыя банкноты. Іх прывозяць пачакамі — напрыклад, 1000 лістоў пяцітысячных купюр, 1000 лістоў статысячных... І праблемы з пастаўкамі банкнот не ўзнікалі ніколі. Але апошнія два месяцы на нашыя запыты завезці банкноты па 10 і 20 рублёў няма ніякай рэакцыі. Іншыя грошы завозяцца без прамаруджвання, а гэтыя чамусьці не, прычым без тлумачэння прычын, — распавядае ён. — Касіры змушаныя альбо не дадаваць кліентам рэшту, альбо наадварот, выдаваць дадатковыя рублі. Праблема ў тым, што, калі ў аддзяленне прыходзіць праверка, нястача альбо лішак нават дробнай сумы грошай прыводзяць да аўтаматычнага пазбаўлення прэміі для касіра і іншых штрафных санкцый. Таму даводзіцца трымаць у кішэні на ўсялякі выпадак некалькі дзесяцірублёвых купюр, каб пры патрэбе можна было дакласці іх».

Пракаментаваць сітуацыю мы папрасілі прэс-службу «Беларусбанка». «Нашае кіраўніцтва такой праблемы не бачаць, недахопу грошай няма. Нашыя аддзяленні маюць пэўную самастойнасць, яны заказваюць грошы ў філіях, а тыя ўжо напрамую замаўляюць грошы, якіх бракуе. Калі праблема ў тым, што старыя купюры сканчаюцца, а новых няма — гэта пытанне да Нацбанка. Усё ж эмітэнт у нас адзіны», — заявіў прэс-сакратар арганізацыі.

### Чуткі з амбразуры

Пасля абыходу шэрага банкаўскіх аддзяленняў у цэнтры Мінска высветлілася, што праблема датычыць не толькі «Беларусбанка». Некаторыя касіры адмаўляліся выдаваць «камерцыйную таямніцу», але некаторыя прызналі — завозы дробных банкнот сапраўды скончыліся два месяцы таму. Такую інфармацыю пацвердзілі, у прыватнасці, супрацоўнікі «Банка «Масква-Мінск».

Знікненне дробных грошай можна патлумачыць як прыкмету дэнамінацыі. Калі стане бачным, што крамы не могуць выдаваць рэшту, насельніцтва само папросіць адкінуць непатрэбныя нуль ці нават два нулі.

Начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанка Анатоль Драздоў катэгарычна абвяргае чуткі: «Я не каментую такія плёткі. Вы дарма слухаеце тое, што вам расказваюць касіры з-за сваёй амбразуры. Калі вы памятаеце, то ў пачатку 2009 года менавіта яны расказвалі кліентам, што ўжо бачылі новыя надрукаваныя грошы, прывезеныя з-за мяжы. Калі ў пэўным аддзяленні няма нейкіх купюр, гэта пытанне да кіраўніцтва банка. Хай замаўляюць больш. У запасе хапае купюр любой вартасці». На думку Анатоля Драздова, сітуацыя з тым, што замовы ігнаруюцца, проста немагчымая.

### Неактуальныя грошы

Дзесяці- і дваццацірублёвыя купюры цяперашняга ўзору былі ўведзеныя ў зварот 1 студзеня 2000 года пасля дэнамінацыі.

Банкнота вартасцю 20 тысяч рублёў, папярэднік цяперашняй «дваццаткі», з'явілася ў 1994 годзе. На аверсным баку надрукаваная выява будынка Нацбанка. На рэверсным знаходзілася выява «Пагоні». Пасля дэнамінацыі яна знікла, а на яе месцы з'явіўся фрагмент інтэр'ера будынка.

Дзесяцірублёвая купюра вылучаецца не толькі памерамі — яна меншая за ўсе астатнія, — але і неактуальнай выявай. Нацыянальная бібліятэка Беларусі, намаляваная на купюры, даўно ўжо пераехала ў іншы будынак, але засталася на грошах.

### Карэйскі досвед

Дэнамінацыя, нават калі б яна і адбылася, цалкам тэхнічная з'ява, якая не мае ніякіх плюсаў і мінусаў для насельніцтва. Адзіныя страты для дзяржавы — сродкі на друкаванне новых банкнотаў. Праўда, у свядомасці старэйшых людзей захоўваюцца ўспаміны пра рабаўніцкія грашовыя рэформы савецкай пары. Апошні выпадак гвалтоўнай дэнамінацыі здарыўся ў Паўночнай Карэі, калі насельніцтву было дазволена памяняць толькі пэўную суму грошай, астатнія былі адабраныя на карысць дзяржавы.

**Яўген Васількоў**

# Машына-месца ў Мінску каштуе амаль як аднапакаёўка

**За некалькі квадратных метраў асабістага паркавачнага месца просяць $20—30 тысяч.**

З кастрычніка гэтага года ў Беларусі з'явіўся новы від нерухомасці — машына-месца.

«У мэтах прастаты і даступнасці працэдуры афармлення такіх аб'ектаў і правоў на іх прадугледжваецца, што машына-месцы будуць падлягаць дзяржаўнай рэгістрацыі. Гэта дазволіць спрацаваць механізм продажу машына-месцаў і павысіць іх прывабнасць для пакупнікоў», — гаворыцца ў афіцыйным каментары да адпаведнага ўказа. Купіць месца для машыны стала лягчэй, але не танней.

Гаворка вядзецца пра падземную паркоўку, якую ўладальнік аўтамабіля выкупляе ў сваю ўласнасць. Такая магчымасць ёсць у жыхароў далёка не кожнага дома — падземныя стаянкі ёсць толькі ў дарагіх новабудоўлях. Напрыклад, кампанія «Інвест-Сістэм», якая будуе дом на праспекце Дзяржынскага ў Мінску, прадае 63 месцы на падземнай стаянцы. Цана кожнага перавышае 83 мільёны рублёў. Гэта каля $28 тысяч! Ва ўласнасць пераходзіць некалькі квадратных метраў заасфальтаванага пакрыцця. Гэта нават не гараж, які можна выкарыстоўваць для захоўвання нейкіх рэчаў. Чаму ж так дарага? «Нашыя эканамісты вылічылі менавіта такую суму. Сістэмы аховы і пажаратушэння, спецыяльнае пакрыццё патрабуюць вялікіх выдаткаў», — кажуць прадстаўнікі кампаніі.



**Машына-месца ў хмарачосе «Ветразь» каштуе $25 тыс.**

У першым беларускім хмарачосе «Ветразь», што будуецца на скрыжаванні вуліц Кальварыйскай і Клары Цэткін, машына-месца каштуе $25 тысяч. На 204 кватэры прадугледжана 203 паркавачныя месцы. «Нашыя кліенты — забяспечаныя людзі. Яны могуць дазволіць сабе такія выдаткі, тым больш што дом знаходзіцца ў цэнтры горада, дзе знайсці іншую стаянку праблематычна», — каментуюць у офісе забудоўшчыка.

Калі шукаць бюджэтны варыянт, то можна знайсці кошт $16 тысяч. Столькі каштуе месца ў доме на Грушаўцы ад кампаніі «Лада-Інвест». Для параўнання, кошт падземных паркавачных месцаў у цэнтры Масквы дасягае $200 тысяч! Сярэдні «бюджэтны» варыянт у спальным раёне расійскай сталіцы каштуе $43 тысячы.

Цікава параўнаць кошт мінскага машына-месца з цэнамі на другасным рынку жылля. Паводле інфармацыі з сайта Realt.by, на продаж выстаўленыя недарагія аднапакаёвыя кватэры коштам $32—33 тысячы. Плошча такіх кватэр складае каля 30 квадратных метраў.

**ЯВ**

## Сцісла

• **Да 2012 года будуць рэканструяваныя дарогі, што злучаюць Мінск з Магілёвам і Гомелем.** Дазволеная хуткасць на іх складзе 120 кіламетраў у гадзіну. Дарогі будуць вызначацца адсутнасцю пешаходных пераходаў, наяўнасцю бар'ерных агароджаў, развязак на розных узроўнях. Наступным этапам будзе рэканструкцыя дарогі на Гродна.

• **Беларусь пачала падрыхтоўку да другога выпуску еўрааблігацый.** Іх размяшчэнне можа адбыцца ў канцы гэтага года ці пачатку 2011-га. Аблігацыі — гэта форма атрымання грошай у пазыку.

• **У Мінску хочуць збудаваць 15-павярховы жылы дом даўжынёй 700 метраў.** Ён з'явіцца на цотным баку праспекта Дзяржынскага, пачнецца ад вуліцы Хмялеўскага і дойдзе да праспекта Жукава. Дом будзе ўзвышацца нават над праезнай часткай вуліцы Шчорса. Вялікая арка дазволіць транспарту рухацца па дарозе.

• **Nemiroff распачаў вытворчасць гарэлкі ў Беларусі.** Напоі выробляюцца ў РУП «Мінск Крышталь».

• **Уладальнік рэстаранаў Lido можа пазбавіцца ўсёй маёмасці.** Латыш Гунарс Кірсанс можа праз пазыкі страціць не толькі галоўную кампанію, але і астатнюю маёмасць. Сума пазыкаў Кірсанса складае $137 мільёнаў. Рэстараны Lido ў Рызе працуюць са стратамі, комплекс адпачынку таксама не акупляе ўкладанняў. Lido — папулярнае месца адпачынку жыхароў беларускай сталіцы.

• **З 1 лістапада павышаны тарыфная стаўка, мінімальны заробак і БПМ.** Тарыфная стаўка першага разраду, на падставе якой разлічваецца аплата працы работнікаў бюджэтных арганізацый, павялічана на 31% і складае 118 тыс. рублёў. Мінімальная зарплата на лістапад—снежань устаноўлена на ўзроўні 400 тыс. рублёў, гадзінная мінімальная — 2360 рублёў. Такім чынам, мінімальная заработная плата павялічана на 54,7%, а гадзінная мінімальная заработная плата на 54,2%. Працоўныя пенсіі, згодна з указам прэзідэнта, узрастуць у сярэднім на 10%. Устаноўлена таксама штомесячная даплата да сацыяльных пенсій у памеры 40 тыс. рублёў дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў, інвалідам I, II і III груп (у тым ліку інвалідам з дзяцінства), а таксама дзецям, якія страцілі кармільца.

• **Лукашэнка згадаў магчымасць прыватызацыі «Белтэлекама».** «Калі вы мадэрнізуецеся, будзеце добра працаваць, то, вядома, застанецеся. Не будзеце імкнуцца — прададзім», — папярэдзіў ён. «Працуеце вы на сённяшні дзень горш, чым сусветныя кампаніі, якія прыйшлі да нас. Мне патрэбная добрая рэнтабельнасць, каб вы плацілі добрыя падаткі».

• **Danone-Юнімілк купіць Слуцкі сыраробны камбінат?** Дамову па куплі кантрольнага пакета акцый беларускага прадпрыемства кампанія плануе правесці падчас інвестыцыйнага форуму ў Франкфурце-на-Майне. У гэтую вытворчасць нямецкі гігант збіраецца ўкласці $250 млн.

**ЯВ**

# Пінская трагедыя: многіх не ўратавалі

Працяг са старонкі 2.

### Лукашэнка не прыехаў у Пінск

29—30 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка наведаў Брэсцкую вобласць. У Брэсце ён праінспектаваў адрамантаваны корпус паліклінікі, новы Палац водных відаў спорту, прагуляўся па пешаходнай вуліцы. У Пружанскім раёне пабываў у агратурыстычным комплексе. У Пінск, насуперак чаканням многіх, ён не заехаў.

Словы спачування і загад ва ўсім разабрацца за кіраўніка краіны пераказала дыктарка тэлеканала АНТ. Няма спачуванняў сем’ям ахвяраў і пацярпелых на «Пінскдрэве» і на афіцыйным сайце Лукашэнкі. Затое ёсць словы спагады прэзідэнту Аргенціны ў сувязі са смерцю мужа, прэзідэнту Інданезіі ў сувязі з землятрусам і цунамі, што забралі жыцці многіх інданезійцаў.

Не аб’явіў Лукашэнка і жалобы ў краіне.

На Брэстчыне 3 і 4 лістапада, па распараджэнні старшыні аблвыканкама Канстанціна Сумара, была абвешчаная жалоба. На мясцовым узроўні гэта было зроблена ў самім Пінску, дзе былі прыспушчаныя дзяржаўныя сцягі. Гульцы мясцовага футбольнага клуба «Хваля» выйшлі на чарговую гульню з чорнымі стужкамі.

**Сямён Печанко**

**Не першы выбух на «Пінскдрэве»**

У 1996 годзе ў тым жа цэху ДСП у выніку выбуху на месцы загінуў адзін рабочы, другі памёр ад апёкаў пазней.

**Сем’ям ахвяр можна дапамагчы грашыма**

Ахвяраваць грошы для сем’яў ахвяр з «Пінскдрэва» можна проста на прахадной прадпрыемства, дзе размясцілі адмысловыя скрыні.

Таксама ў пінскім аддзяленні «Прыёрбанка» сумеснымі намаганнямі царквы Святой Варвары і Пінскага гарсавета адкрылі дабрачынны рахунак. Сродкі, якія паступяць на рахунак, будуць размяркоўвацца гарсаветам супольна з Пінскай епархіяй паміж сем’ямі.

«Прыёрбанк», ЦБУ 506, г.Пінск
Код 153001749
УНН 200320085
р/р 3015520162218


SVABODA.ORG

## «Не даю ім падмятаць, пакуль вадой не папырскаюць»

На мэблевых фабрыках ідуць пазапланавыя праверкі.

«Мы пакуль не маем вынікаў афіцыйнага расследавання, таму кіруемся папярэднімі высновамі пра прычыны выбуху. А менавіта — праблемы з вентыляцыяй і ўтварэннем у выніку гэтага пажара- і выбуханебяспечнай канцэнтрацыі пылу», — паведаміў інжынер па тэхніцы бяспекі Лідскай мэблевай фабрыкі Сяргей Аўраменка.

«На наступны ж дзень я выдаў загад пра пазапланавую праверку сістэмы вентыляцыі і інструктажы персаналу. Рэакцыя на пінскі выбух была магутная, мы ж роднаснае прадпрыемства», — патлумачыў ён.

Сяргей Міхайлавіч расказаў, як асабіста кантралюе працу прыбіральшчыц. «Заробкі ў іх невысокія, таму многія лянуюцца. То я не даю ім падмятаць падлогу, пакуль вадой не папырскаюць, каб пыл не ўздымалі. Сам бяру пластыкавую пляшку, прабіваю цвіком дзіркі ў корку і аддаю прыбіральшчыцам. Ды яшчэ прасачу, каб выкарыстоўвалі». Пазапланавую праверку працоўных месцаў і генеральную прыборку вентыляцыйнай сістэмы зладзіў «Гомельдрэў». Тут таксама кіраваліся папярэдняй версіяй здарэння ў Пінску. Інструктажы і агляд працоўных месцаў правялі на «Магілёўдрэве».

**СП**

**Спіс пацярпелых, якія знаходзяцца ў шпіталях, паводле Пінскай цэнтральнай бальніцы:**

У абласной бальніцы Брэста:
1. Смірноў Алег, 1981
2. Гарошка Эдуард, 1977
3. Ярмак Павал, 1976

У бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі ў Мінску:
1. Гладун Наталля, 1967
2. Пілевіч Віталь, 1981
3. Касьян Міхаіл, 1977

**Спіс памерлых:**
1. Муга Ігар, 1971
2. Рапута Яўген, 1984
3. Старадуб Міхаіл, 1958
4. Міхаевіч Аляксандр, 1976
5. Саковіч Кацярына, 1986
6. Жукоўскі Віктар, 1955
7. Казюр Генадзь, 1964
8. Калодзіч Аляксандр, 1987
9. Тарэлка Сяргей, 1985
10. Квашалі Алег, 1962
11. Мароз Аляксандр, 1987
12. Хамлюк Аляксандр, 1959
13. Шаўчук Мікалай, 1950
14. Шынкарук Аляксандр, 1974.

## Мілінкевіч заклікаў абвясціць нацыянальную жалобу

Абвясціць нацыянальную жалобу ў сувязі з трагедыяй у Пінску заклікаў лідар Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч. Ён звярнуўся з адмысловым зваротам да Лукашэнкі. Ягоны заклік падтрымалі кандыдаты ў прэзідэнты Рыгор Кастусёў, Алесь Міхалевіч, Віталь Рымашэўскі і Андрэй Саннікаў.

## Трагедыя 1972-га

Найбольш масавай па колькасці ахвяраў тэхнагенная катастрофа ў Беларусі здарылася на Мінскім радыёзаводзе 10 сакавіка 1972 г. У выніку выбуху ў цэху па вырабе тэлевізійных футаралаў загінулі 143 асобы.

## Пажар у Мінску

У гэтым годзе пры тушэнні пажару на складзе Мінскага завода вылічальнай тэхнікі ў выніку абрушэння перакрыццяў загінулі чатыры ратавальнікі. Трагедыя здарылася 11 мая.

**СП**

# Падлодка «Курск» у беларускім стылі

Людзям у Пінску трэба дапамагчы ўсенародна. Піша **Віталь Сіліцкі**.

Звесткі пра новых памерлых у выніку выбуху ў Пінску, што прыходзяць кожны дзень, агаляюць не толькі рэальны памер трагедыі, але і памер маральнай прорвы ў нашым грамадстве і, на жаль, у нашай грамадзянскай супольнасці.

Нам усім хацелася, каб ахвяраў было меней — але іх стала болей.

У нас усіх былі іншыя справы, і мы спадзяваліся, што бядзе дадуць рады тыя, хто мусіць даваць рады ў гэтых сітуацыях — але мы не ўзгадалі, у якой краіне мы жывём.

У Пінску, дзе я быў на гэтых выходных, пануе атмасфера пакінутасці. Людзі не вераць, што мы пра іх бяду ведаем нашмат больш, чым яны самі. Адчуванні, што кінуты сам-насам, ва ўсіх.

Усе цытуюць, колькі тэлеграмаў віншаванняў і спачуванняў даслаў за апошні дзень Лукашэнка (зводкі БТ успрымаюцца як суцэльны здзек) і ніхто не разумее, чаму беларускі лідар не завітаў у Пінск падчас вандроўкі па Берасцейшчыне.

Да мясцовых уладаў пытанняў якраз менш, чым да іншых (не тое, што іх няма, але іх менш). Тыя пастараліся з кампенсацыяй (можна спрачацца пра яе памеры), банкі і сам «Пінскдрэў» згадзіліся пагасіць крэдыты тым, хто трапіў у бяду, у горадзе абвешчана жалоба, праводзяцца дабрачынныя акцыі. Аднак відавочна, што наверсе хутчэй зацікаўлены ў перадухіленні піяр-правалу падчас перадвыбарчай кампаніі.

Справа нават не ў тым, што дзяржава не дапамагла ці недадапамагла — справа ў тым, што мы не змаглі зрабіць усё, што магчыма, таму што зрабіць усё, што магчыма, не было нашым супольным прыярытэтам.

Здаецца, выбарчы вірус абыякавасці паралізаваў нармальныя чалавечыя рэакцыі і з апазіцыйнага боку. Ведаю, што і палітыкам, і іх паплечнікам баліць за тое, што адбылося. Але спробы высветліць, чаму ж вы не рэагуеце ніяк, натыкаліся на наступныя адказы. Па-першае, хто ж туды пусціць, да людзей да месца выбуху? Па-другое, адразу ж абвінавацяць у тым, што імкнёмся зарабіць палітычны капіталец на чужым горы. Што тут адказаць? Што да адсутнасці магчымасцяў — то на гэта спасылаецца той, хто нічога не хоча рабіць.

Насамрэч трагедыя ў Пінску — гэта тэст на сапраўднасць пэўных апазіцыйных ініцыятываў, якія расквітнелі падчас выбараў. Каб дапамагчы людзям, трэба рэальныя людзі ў канкрэтным месцы, якія б маглі дапамагчы сабраць інфармацыю і дастукацца да людзей, якім патрэбна дапамога і якія могуць нешта змяніць. У канкрэтных дзеяннях зусім іншая логіка, чым у віртуальнага піяр-праекта.

Што да абвінавачванняў — то калі чалавек шчыра хоча дапамагчы людзям (а дзеля гэтага яны збіраюцца ў прэзідэнты, здаецца), то выбар паміж шанцам на дапамогу і піярам мусіць быць адназначным. Калі чалавек, які хоча ўскінуць на сябе адказнасць за ўсю дзяржаву, адвернецца ад чужой бяды, толькі каб захаваць некалькі адсоткаў галасоў, то, даруйце, мне не патрэбны такі прэзідэнт. Аднаго такога, здаецца, ужо маю.

Аднак час не для ўзаемных папрокаў. Аблажаліся, не праявілі нармальнай грамадзянскай, нават чалавечай рэакцыі ўсе ці амаль усе — як на ўладным, так і на апазіцыйным флангу. А таму — лепш пазней, чым ніколі.

Важна не толькі выправіць памылку. Калі мы не дамо рады ўласнай абыякавасці — гэта значыць, што абыякавасць стала нормай у нашым грамадстве і мы з ёй цалкам згодны. Тады грош цана ўсім нашым кампаніям, партыям, кааліцыям, форумам, партнёрствам, інстытутам і кандыдатам. Мы не ў стане змяніць Беларусь, калі мы не ў стане змяніць саміх сябе.

Па-першае, шмат хто з людзей гатовы дапамагчы, але не можа гэтага зрабіць з банальнай прычыны, што дапамагчы не тое што няма каму, а няма праз каго. Патрэбны нейкі пункт для збору і пераводу дапамогі, рахунак або іншы спосаб. Або запатрабаваць, каб такое зрабіла ўлада, або Чырвоны крыж, або збіраць самім.

І ў апазіцыйных кандыдатаў у прэзідэнты, паверце, не ўпадзе рэйтынг, калі яны здолеюць акумуляваць і перавесці сем’ям ахвяраў і пацярпелых дапамогу ў аб’ёме хаця б такім, у якім яе аказала дзяржава. Гэта быў бы разумны сімвалічны крок. Каб даказаць, што апазіцыя можа не менш, чым улада, варта было б даказаць гэта на канкрэтным прыкладзе. Паверце, тым, каму такая дапамога патрэбна, возьмуць і не будуць на вас вешаць піяр, шмат хто з іх на мяжы выжывання.

Па-другое, пацярпелыя пры аварыі знаходзяцца ў жудасным стане. Траўмы і апёкі запатрабуюць доўгага лячэння і рэабілітацыі. Патрэбна, прынамсі, спраўдзіць, што ў Беларусі дастаткова тэхнічных магчымасцяў, лекаў і адмыслоўцаў, каб аказаць ім дапамогу. Адказу, ці дастаткова, у мяне пакуль няма, але прэса, няўрадавыя арганізацыі мусяць гэта спраўдзіць. Шліце запыты, стаўце пытанні, патрабуйце адказу і, калі патрэбна дапамога па гэтай лініі, трэба думаць далей, дзе яе шукаць. Прынамсі, не лішняе, каб запатрабаваць адпаведных зменаў у рэспубліканскі бюджэт.

Па-трэцяе, пытанне працаўладкавання людзей, якія цяпер пазбавіліся працы. «Пінскдрэву», Пінску для гэтага запатрабуюцца пэўныя інвестыцыі. Наколькі мне вядома, абсталяванне на заводзе было застрахавана і сітуацыя шмат у чым папраўная, але людзям патрэбна праца, заробак, сродкі для існавання тут і цяпер. Для пачатку варта было б запатрабаваць ад улады, каб змяніла сваю інвестыцыйную палітыку ў Берасцейскай вобласці і адмовілася б ад аднаго абрыдлага ўсім спартовага аб’екта, каб адрадзіць вытворчасць на «Пінскдрэве».

Давайце разам паспрабуем зрабіць хоць нешта з гэтага — апазіцыя, прэса, грамадскія арганізацыі. Адкладзём убок палітычныя калькуляцыі і ўстрымаемся ад узаемных абвінавачванняў у тым, што нехта штосьці не ў час зрабіў. І проста пачнём выпраўляць агульныя памылкі. Бо Пінск — гэта наш супольны «Курск», супольная «Катрына», і выбрацца з маральнай ямы можна толькі разам і толькі адназначна расставіўшы прыярытэты.

# Ганчарэнка з'едзе з БАТЭ ў Маскву?

Галоўны трэнер БАТЭ адказаў на пытанні «Нашай Нівы» перад адказнай гульнёй Лігі Еўропы з цірaспальскім «Шэрыфам».

**«Наша Ніва»: За кошт чаго можна перамагчы «Шэрыф»?**

**Віктар Ганчарэнка:** У нас каманда высокага ўзроўню, каб можна было разлічваць на перамогу ў кожным матчы. А па-другое, на гульню з «Шэрыфам» павінна быць аграмадная матывацыя футбалістаў, бо ў выпадку перамогі мы маем шанцы трапіць у плэй-оф.

**«НН»: Будзе цяжэй ці лягчэй у параўнанні з Цірaспалем?**

**ВГ:** Дома гуляем лепей, як мноства каманд. Таму спадзяёмся, што будзе лягчэй.

**«НН»: Чаму на матчы БАТЭ ў еўракубках перастаў збірацца поўны стадыён?**

**ВГ:** Цяжка меркаваць. Для балельшчыкаў важны камфорт на трыбунах, а не сядзець пад адкрытым небам і спадзявацца, толькі б не пайшоў дождж. Альбо думаць, чым можна сагрэцца. Вядома, і кардоны міліцыі, працу якіх цяпер актыўна абмяркоўваюць на форумах і ў прэсе, не садзейнічаюць прыходу вялікай колькасці людзей. Яшчэ важная шыльда матча. Спадзяюся, што на матчы з «Дынама» (Кіеў) будзе поўны стадыён. Але балельшчыкі мусяць разумець, што матч з «Шэрыфам» вельмі важны.

**«НН»: У чэмпіянаце барацьба за «золата» працягваецца. Летась вы сталі першымі задоўга да фінішу.**

**ВГ:** Кожны новы чэмпіянат — гэта свая асобная гісторыя. Сёлета нас яшчэ чакаюць тры гульні. Будзем выкладвацца ў іх па поўнай праграме. Будзем імкнуцца парадаваць нашых аматараў. Натуральна, што барацьба на ўнутраным фронце не менш важная.

**«НН»: Апошнім часам шмат гавораць пра Ваш магчымы сыход з БАТЭ па сканчэнні сезона. Прынамсі, гавораць пра маскоўскі «Лакаматыў».**

**ВГ:** Гэта ўсё чуткі.

**«НН»: А што нарэшце футбалістаў? З касцяка гульцоў нехта можа пакінуць клуб?**

**ВГ:** Усё можа быць. Нічога выключаць не буду. Калі футбалісту прапануюць выгадны кантракт, які задаволіць і клуб, і спартсмена, то чаму не? Але пакуль такіх аднаначных прапаноў не было.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**



PHOTO BYMEDIA.NET

**4 лістапада, 20.00. Стадыён «Дынама» (Мінск).**
Білеты каштуюць ад 10 да 30 тысяч.

БЭЛЬКАНТА

## Анісімаў на плошчы Багушэвіча

4 лістапада ў Мінску адбудзецца раскошны канцэрт. Піша **Юлія Андрэева**.

У Музычным тэатры — чарговая яркая падзея. Цэнтр музычна-тэатральнага жыцця ўсё мацней зрушваецца з Траецкай гары, на якой стаіць Опера, у бок плошчы Багушэвіча (былой Клары Цэткін).

У Тэатры оперы і балета ўсё дзелавіта: былыя міністэрскія чыноўнікі ў кіроўных крэслах, прыезджы галоўны рэжысёр і галоўны дырыжор (абодва без харызмы), дысцыпліна, парадак, усе прэм'еры выпускаюцца ў належны тэрмін. Іх запрасілі і сказалі: «Зрабіце нам прыгожа!» Вось яны і робяць... прафесійна, але без натхнення. Нічога асабістага — проста праца.

У Музычным тэатры ёсць запал і жаданне спрабаваць сілы ў розных жанрах.

Цяпер Музычны тэатр жыве як бы ў двух часавых вымярэннях. З аднаго боку, адбываецца пастаноўкі, закладзеныя ў план яшчэ былым галоўным рэжысёрам Ісаевым. Часам гэта ўдаецца («Аднойчы ў Чыкага» ў пастаноўцы Сусанны Цырук), часам цалкам правальна («Мая жонка ілгуння»).

Але і поспехі, і паразы даказваюць адно: савецкая музычная камедыя памерла. Трэба шукаць новы шлях.



Ставіць мюзіклы. Або класічныя аперэты, якія трэба папярэдне ачысціць ад пахабных напластаванняў. Або папулярныя оперы ў сучаснай, свежай пастаноўцы. Плюс яркія, «неакадэмічныя» балеты, накшталт узнёўленага нядаўна «Мефіста».

Але як гэта зрабіць, калі тэатр першапачаткова быў "заточаны" пад савецкую музычную камедыю, а былы мастацкі кіраўнік Ісаеў вынішчаў парасткі чагосьці іншага?

Цяпер на нашых вачах гэтыя парасткі ператвараюцца ў прыгожыя дрэвы.

Такім стаў праект, ініцыяваны новым кіраўніцтвам, — «Музычныя вечары з Аляксандрам Анісімавым».

Першы такі адбыўся 9 чэрвеня з велічэзным поспехам. Другі — «Італьянскае капрычыа» — мае быць 4 лістапада. У ім удзельнічае не толькі аркестр Музычнага тэатра, але і хор. Якое шчасце для музыкаў і харыстаў, якіх Ісаеў прысудзіў да вечнай катаргі ў выглядзе «Бабскага бунту»!

Гэтым разам маэстра Анісімаў пераключыўся на «чыстую» оперу. Адзіны сімфанічны твор, што прагучыць, — «Італьянскае капрычыа» Чайкоўскага. Яркая, «шлягерная» рэч, якую кожны ведае на слых. У дадатак будуць фрагменты з опер "Яўгеній Анегін" і «Пікавая дама», напісаных кампазітарам амаль суцэльна ў Італіі.

У другім аддзяленні будзе гучаць італьянская музыка з дамешкам «французшчыны» — знакамітай баркаролы з оперы Афенбаха «Казкі Гофмана». «Нябёсная» музыка спецыяльна для дзвюх цудоўных спявачак, што ўдзельнічаюць у канцэрце.

Гэта, па-першае, выпускніца Акадэміі музыкі, салістка Операў Мінска і Масквы, меца-сапрана **Аксана Волкава (на фота)**. Па-другое, вядучая салістка Пермскай оперы, сапрана Ірына Крыкунова.

Вы спытаецеся, чаму б замест Крыкуновай не запрасіць беларускую спявачку? Як патлумачыў спадар Анісімаў, оперныя спевакі ў нашай краіне — людзі паднявольныя, і кіраўніцтва тэатра можа нечакана «сарваць» іх з канцэрта, хоць графік рэпетыцый і спектакляў сёлета распісаны да канца сезона.

Аксану Волкаву «адрэгуляваць» не ўдаецца толькі таму, што яе кар'ера выйшла за межы Беларусі. Паралельна з рэпетыцыямі ў Анісімава яна ездзіць у Маскву на рэпетыцыі «Царскай нявесты». Аднак дамовіцца з ёй і з Крыкуновай, якая шчыльна занятая ў Пярмі, было працей, чым са спявачкамі, якія стабільна знаходзяцца ў Мінску. Можа, таму, што цяперашняе кіраўніцтва Оперы спадара Анісімава не надта прывячае? Як і іншых высокапрафесійных беларускіх дырыжораў — Андрэя Галанава і Алега Лесуна. Здавалася б, у Оперы яны болей патрэбныя, але супрацоўнічаюць сёння з Музычным тэатрам.

...Што датычыць спявачак, дык абедзве яны ў канцэрце будуць выконваць «арыі найвышэйшага пілатажу». Крыкунова — кавату Нормы «Casta Diva» з галавакружна цяжкай стрэтай, якую савецкія сапрана ніколі не спявалі. Волкава — арыю Арзачэ з оперы Расіні «Семіраміда». Свае яркія моманты будуць і ў хору. Вечар абяцае быць цікавым!

### Здарэнні сцісла

• **17-гадовую дзяўчыну знайшлі ў пятлі каля царквы.** Трагедыя здарылася ў вёсцы Ганчары Лідскага раёна, дзе захаваўся строгага харaства стары драўляны храм. 17-гадовая дзяўчына была з вёскі Лайкаўшчына, навучалася на першым курсе Бярозаўскага ліцэя. Следства высвятляе, ці насамрэч дзяўчына засілілася і чаму менавіта на цвінтары.

• **Тэлефанаваў невядомы і называўся следчым.** Распачата шэсць крымінальных спраў у дачыненні да 21-гадовага грамадзяніна Літвы, які падазраецца ў серыі махлярстваў. Схема злачынства ва ўсіх выпадках была адной. На гарадскі нумар тэлефанаваў невядомы і называўся следчым. Выпытваў у абанента пра яго блізкіх сваякоў (сына, унука). У залежнасці ад адказаў выбудоўвалася далейшая гутарка, сэнс якой зводзіўся да таго, што сваяк збіў (калі гэта аўтааматар) ці пабіў (калі гаворка ідзе пра пешахода) чалавека і цяпер затрыманы міліцыяй. Для «вырашэння пытання» неабходна некаторая сума. Падчас паўгадзіннай гутаркі дасягалася дамоўленасць. Яго памочнік прыходзіў за грашыма яшчэ падчас тэлефонных перамоў. Пацярпелыя пазней пачыналі тэлефанаваць сваякам, якія нібыта трапілі ў бяду, і высвятлялі, што сталі ахвярай аферыстаў.

• **Збіў пешахода і цягнуў паўтара кіламетра.** У Жлобіне кіроўца пасажырскага аўтобуса збіў 50-гадовага мужчыну, які памёр на месцы. Цела зачапілася за аўтобус, які цягнуў яго па вуліцах амаль паўтара кіламетра. Здарэнне адбылося ў прыцемку, пешаход не меў флікера. Няясна, як ён трапіў пад колы. Не выключана, што ляжаў на дарозе.

• **Тры сястрычкі загінулі на пажары.** Трагедыя адбылася ў вёсцы Камаровічы Петрыкаўскага раёна. Да прыбыцця пажарнікаў агонь згасілі суседзі. З дома вяскоўцы вынеслі целы двухгадовай Аліны, трохгадовай Наташы і пяцігадовай Дашы. Паводле папярэдняй версіі, прычынай узгарання стала дзіцячае свавольства з агнём. Дзяўчынкі былі дома адны. Іх бацькі пайшлі ў госці да суседзяў, а старэйшыя дзеці былі ў бабулі.

• **Студэнт скраў скрыню ружаў.** Гуляў, даты, ля гандлёвага дома «На Нямізе» ў Мінску. Пабачыў кветкавы латок, і рукі засвярбелі. Замок аказаўся нямоцным. З ахапкам ружаў хацеў уцячы, але яго скруцілі вартаўнікі крамы. Зараз яму пагражае да чатырох гадоў турмы.

• **Упалі з 6-га паверха.** Двое рабочых Мазырскага домабудаўнічага камбіната вываліліся з будаўнічай люлькі. Хлапцоў 25 і 29 гадоў завезлі ў бальніцу пакалечаных. Цяпер яны ў рэанімацыі. А прычынаю была няспраўнасць механізма. Рабочых ўзнімалі наверх, калі пераламалася страла, да якой мацуецца люлька.

• **Пад Ашмянамі згарэў міліцыянер.** Трагедыя здарылася ў гасцявой хатцы ў вёсцы Грынцы. 36-гадовы капітан працаваў намеснікам начальніка службы эскартавання спецпадраздзялення дарожна-паставой службы «Страла» МУС. Супрацоўнікі «Стралы» патрулявалі тэрыторыю. У тым дамку яны начавалі. Прычынай узгарання магла быць цыгарэта, няспраўная электраправодка або парушэнне правілаў карыстання камінам. У міліцыянтаў узялі кроў на экспертызу.

• **Затрыманы дырэктар дзяржаўнай аўташколы.** 60-гадовага жыхара Гродна падазраюць у атрыманні хабару за здачу ўнутраных экзаменаў. «На лапу» давалі ад 20 даляраў да 80 тыс. рублёў.

**СМ**

# Някляеў хоча стаць больш рускім за Лукашэнку

Працяг са старонкі 2.

Кіраўнік выбарчага штаба Няклява Андрэй Дзмітрыеў удакладніў, што «цяпер капітал не мае нацыянальнай прыналежнасці». А палітолаг Святлана Навумава дадала, што расійскі капітал, які можа прыйсці ў Беларусь, не абавязкова будзе алігархічным.

«У Расіі з'явілася «другая хваля» прадпрымальнікаў і бізнесменаў, якія маюць намер весці свой бізнес празрыста і адкрыта», — верыць Святлана Навумава, дарадчыца Няклява.

І гэта ў часе, калі ў рэйтынгах карупцыі Расія апусцілася на апошнія пазіцыі ў свеце.

Зрэшты, ці верыць? Цынізму ў выказваннях ідэолагаў «Гавары праўду» больш, чым наіўнасці.

Напрыклад, адначасова Няклеў абяцае наблізіць Беларусь да еўрапейскіх стандартаў, каб «разам з Расіяй і Украінай» зблізіцца з ЕС. Але кожны паэт ведае, што Украіна, нягледзячы на вялізны ціск, адмовілася пусціць «Газпром» у сваю энергатранспартную сістэму.

Нават ЕС, залежнасць якога ад расійскіх энерганосьбітаў ніжэйшая і дзе транзіт ў эканоміцы адыгрывае меншае значэнне, перасцярогся.

Еўрасаюз увёў норму, паводле якой транспартныя сеткі, напрыклад, газаправоды, не могуць належаць вытворцам, напрыклад, «Газпрому», каб не ўтваралася манаполія. А Беларусь жа ў гэтым пытанні нашмат больш уразлівая, чым ЕС.

Беларусь абавязаная быць асцярожнай з допускам расійскага капіталу, з улікам таго, што Расія і без таго ўжо валодае магутнымі інструментамі ўплыву на Беларусь.

«Гавары праўду» хоча захапіць нішу прарасійскай палітычнай сілы, стаць больш рускімі за Аляксандра Лукашэнку. Адсюль і гэтае прапанаванне саступкі найкаштоўнейшых эканамічных актываў.

Дарэчы, ёсць уражанне, што кампанія не таго лідара сабе абрала. Няклеў недастаткова прарасійскі для тых дзецюкоў, якія за ім стаяць.

Культурная праграма Няклява лепшая за лукашэнкаўскую.

У гэтай частцы палітычная агітацыя «Гавары праўду» нясе пазітыў, бо адмаўляе саветызм і аўтарытарызм і прапануе падтрымчыя меры для беларускай культуры, хоць і з захаваннем расейскай мовы ў якасці дзяржаўнай.

Эканамічная праграма Няклява горшая за лукашэнкаўскую. Рэалізацыя такой праграмы прывяла б да росту карупцыі і сацыяльнай дэградацыі.

Да таго самага, да чаго яна прывяла ў самой Расіі. Лукашэнка, прынамсі, не ставіць праграмнай задачы продажу беларускага родавага срэбра — заводаў і нафтаправодаў — Расіі.

Нават калі палітычная вага Няклява знікомая, ягоная рыторыка прабуджае апетыты расійскага капіталу.

**Андрэй Дынько**




# Тры прэтэнзіі экскаватаршчыка да Лукашэнкі

**Гэтыя словы сказаў мне адзін геній. Бо геніяльнымі бываюць не толькі пісьменнікі ці музыканты. Гэта геній цяжкой будаўнічай машыны. У яго руках нязграбны пагрузчык «Амкадор» робіць рэчы проста філігранныя.**

Не смейцеся: я ведаю, што кажу. Распачаўшы будоўлю, нагледзеўся на няздарнасць большай паловы найманых работнікаў. Пачынаеш цаніць сапраўднае майстэрства і рукі, якія растуць з патрэбнага месца.

«Я проста хачу пераменаў. Каб хоць нешта змянілася. Які гэта быў філосаф, што напісаў «Кнігу пераменаў»? Бо вельмі цяжка жыць. У мяне жонка — інвалід, дзеці, я адзін працую. Заробак палучылі — у той самы дзень яго няма. Пайшоў рабіць у дзяржаўную арганізацыю, каб далі інтэрнат. Спрабаваў дабіцца льготнага крэдыту на будаўніцтва жылля як маладой сям'і, хадзіў па кабінетах. Наглядзеўся на такую бюракратыю, на гэтае, проста сказаць, б...ва...»

Мікалай не скардзіўся. Проста адчувалася, што яму хочацца выгаварыцца. А гутарку пра выбары мы пачалі нечакана самі для сябе. Гэтая тэма яшчэ электрызуе грамадства, у пераважнай большасці да палітыкі абыякавае. Людзі адчуваюць, што прэзідэнцкія выбары, у адрозненне ад парламенцкіх, мясцовых, здольныя істотна змяніць жыццё.

«Сёння чалавек не свабодны, — казаў Мікалай. — Работы — валам. Але няма ініцыятывы. У нас майстры папрыходзяць на працу і сядзяць, чакаюць, пакуль дырэктар прыедзе і загадае, што рабіць».

Так, дзяржаўная машына, што складаецца з вінцікаў, зручная ў кіраванні, аднак ніводзін вінцік не кранецца з месца без адпаведнага начальніцкага вокрыку. Пра вокрык Мікалай, дарэчы, таксама не забыўся. І тут быў найбольш катэгарычны: «Ніякага Лукашэнкі. Што гэта такое, калі ён інтэлігентнаму чалавеку — «Ты!» А той, галаву ўгнуўшы, слухае...»

Мікалай не ведае імёнаў апазіцыйных кандыдатаў, ён не чытае незалежных газет. Ён працуе на сваю сям'ю — з ранку на дзяржаўнай працы і на калымах увечары. Але ён дакладна сфармуляваў тры прыкметы лукашэнкаўскай улады, ад якіх закіпаюць ужо сотні тысяч людзей: несправядлівасць, несвабода, хамства.

**Аляксандр Несцяровіч, gmail.com**

# Мат — гэта не нармальна

Піша **Канстанцін Карнялюк**.

Чалавек, які брыдкасловіць, абражае не столькі маці субяседніка, колькі сваю ўласную. Існуе легенда пра паходжанне мацяршчыны: чалавек, якога паблытаў д'ябал, забіў свайго бацьку і ажаніўся з маці — менавіта з таго часу і пайшла мацерная лаянка.

Раней у беларусаў недапушчальнай лічылася лаянка на жанчыну. Не лаялі і дзяцей — інакш на тым свеце дзеці адвернуцца ад маці, якая на іх лаялася, не пазнаюць яе.

Бацькоў жа, якія такім чынам клянуць сваіх дзяцей, чакаюць смяротныя пакуты.

Нашы продкі лічылі, што брыдкія словы прыцягваюць нячыстую сілу. Анёлы ж, наадварот, пакідаюць такое жытло.

На жаль, мат у нашым быце стаў масавай з'явай. Чалавек, які не ўжывае брыдкіх слоў, выглядае для многіх дзіўным і падазроным...

У нас так гавораць усе! Алкаголікі, бамжы, хуліганы — што з іх узяць? Паклікаць міліцыянера і пасадзіць на некалькі сутак?! Ды міліцыянты і самі лаюцца. Лаюцца нармальныя, цвярозыя, дзелавыя людзі, якія актыўна і плённа працуюць. Нельга іх саджаць, бо ўмомант апусцеюць гарады і вёскі. Спыняцца станкі і трактары. Закрыюцца школы, вучылішчы, ВНУ, бальніцы, базары... Жыццё заціхне!

Мат утульна адчувае сябе ў рэспектабельных кабінетах, у асабістых і службовых аўтамабілях. Пра грамадскі транспарт і гаварыць не даводзіцца: нішто не зьліжае так нашых людзей, як расквечаны, адборны густы мат у гадзіну пік! Брыдкаслоўе адкрыта і шматаблічна прысутнічае на стадыёнах, за кулісамі тэатраў, у клубах і лабараторыях.

Сёння стала ўжо можна пры дзецях. Пры жанчынах і дзяўчатах таксама можна. І нікому не сорамна! Нават многія настаўнікі спакойна праходзяць міма, калі вучні лаюцца і кураць, п'юць піва каля роднай школы... «Патаемны брыдкаслоў» — менавіта так ахарактарызаваў свайго героя Зелянова мой любімы пісьменнік Уладзімір Караткевіч. А колькі сярод нас такіх патаемных брыдкасловаў, якія, не прамаўляючы, праклінаюць бліжняга...

Да чаго мы прызвычаіліся? А прызвычаіліся мы да штодзённага ўбоства. І забываем прыгожыя, добрыя словы, забываем казаць «Добры дзень! Дзякуй! Калі ласка...».

Паветра, якім мы дыхаем, стане чысцейшым і мы пахарашэем, калі адмовімся ад брыдкага.

Прачытаў у пісьменніка Макара Паслядовіча залатыя словы: «Бывай здароў і раз назаўсёды запомні: размаўляць са мною пры дапамозе мата не дазволю».

*Гродна*

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

### Бюракраты пранікі ў пракуратуру

**Калі я працаваў сам у пракуратуры, нагляд за выкананнем заканадаўства па зваротах грамадзян сапраўды быў адным з важнейшых напрамкаў пракурорскага нагляду.** Калі ж мне ў чэрвені гэтага года давялося звярнуцца ў розныя інстанцыі (у тым ліку і Адміністрацыю прэзідэнта) для вырашэння дробнага пытання — рамонту даху над маёй кватэрай, я атрымаў гару адпісак, супярэчлівых па сваім змесце, скажаючых ідавочныя факты, аднак дах да гэтага часу не адрамантаваны.

Я звярнуўся ў органы пракуратуры ўжо з нагоды парушэння заканадаўства аб зваротах грамадзян. Упэўнены, яшчэ восем гадоў таму па маім звароце была б абавязкова праведзеная пракурорская праверка. Але, відаць, калі пракуратурай кіруе юрыст хаця і без сумневу дасведчаны, аднак які ніколі раней не працаваў у ёй, наглядныя функцыі пракуратуры могуць ператварыцца ў фікцыю. Мой зварот некалькі разоў быў запушчаны па бюракратычным коле з цалкам прадказальным вынікам.

**Андрэй Галюк, Мінск**

### Дзе прадаць яблыкі?

У гэтым годзе на дачы вырас вялікі ўраджай яблыкаў. Закупныя, дзяржаўныя цэны нізкія, а прадаць на вуліцы — адразу з'яўляецца міліцыя і будзе ганяць. Няўжо нельга зрабіць вольны кірмаш, як у несцерцы. А пакуль яблыкі выкідваем на звалку.

**Сяргей Норман, Мінск**

### Не выбары прынясуць змены

**Некаторыя палітыкі загуляліся ў «еўрапейскую палітыку».** Забыліся, што ў Беларусі няма палітыкі ў тым разуменні, што ў Еўропе. У нас ёсць змаганне з рэжымам, які арыштоўвае за палітычныя погляды, фальсіфікуе выбары, абражае людзей без прычыны. Няма «выбараў», падліку галасоў і магчымасці чэснай перамогі.

Зараз на першым месцы павінна быць перамога над злачынным рэжымам, а не развагі пра падрыхтоўку на наступныя выбары.

Такія змены могуць адбыцца толькі шляхам мірнай рэвалюцыі кшталту тых, якія адбыліся 20 гадоў таму ў Цэнтральнай Еўропе.

Я за такую рэвалюцыю! Гатовы аддаць жыццё за Беларусь! А Вы?

**Юрый Салодкі, актывіст Руху «За Свабоду», былы кандыдат у дэпутаты Мінгарсавета**

# Ярмошына: У мяне язык не паварочваецца сказаць «сабралі подпісы»

Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына падзялілася з журналістамі вынікамі этапу збору подпісаў патэнцыйнымі кандыдатамі на пасаду прэзідэнта.

### Някляеў і Саннікаў у лідарах

Па яе словах, неабходныя сто тысяч у ЦВК здалі адзінаццаць кандыдатаў. «У мяне язык не паварочваецца сказаць, што прэтэндэнты сабралі подпісы, таму я і кажу, што здалі», — кажа Л.Ярмошына.

«Нават пры першасным аглядзе кідаюцца ў вочы шматлікія парушэнні», — працягвае кіраўніца выбаркама. Найперш яна кажа, што некаторыя кандыдаты падавалі не арыгінальныя подпісы, а ксеракопіі, што забаронена. Хто менавіта з кандыдатаў рабіў так, спн.Ярмошына не адказала.

Праверка падпісных лістоў будзе праходзіць да 8 лістапада.

Калі браць дакладныя лічбы па кожнаму з кандыдатаў, то яны выглядаюць наступным чынам:

Аляксандр Лукашэнка — 1 113 014 подпісаў;

Уладзімір Някляеў — 193 829;

Андрэй Саннікаў — 150 168;

Яраслаў Раманчук — 128 699;

Віктар Цярэшчанка — 122 520;

Алесь Міхалевіч — 120 531;

Мікола Статкевіч — 117 989;

Дзмітрый Ус — 110 753;

Уладзімір Правальскі — 109 338;

Рыгор Кастусёў — 107 083;

Віталь Рымашэўскі — 105 318.

Лідзія Ярмошына кажа, што магчымасць рэкорднай колькасці зарэгістраваных кандыдатаў не трэба выключаць. «Падыход будзе законным. На хлусню вочы заплюшчваць не будзем», — кажа старшыня ЦВК.

### Што можна БРСМ, грамадзянам нельга

Скончылася вылучэнне прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій. Іх было сфармавана 6390. Для працы ў іх падало заявы 83 960 чалавек.

Ярмошына кажа, што задаволіць усе заяўкі, натуральна, будзе немагчыма. На гэта карэспандэнт радыё «Свабода» Уладзімір Глод зазначыў, што як тады можна на 100% уключаць усіх вылучэнцаў ад БРСМ, як было зроблена пры фармаванні тэрытарыяльных камісій.

Ярмошына не разгубілася: «Значыць, людзей добрых вылучылі». На яе думку, у любым выпадку вырашаць гэта будуць мясцовыя ўлады. «Важным з'яўляецца, наколькі гэтыя людзі здольныя працаваць у камандзе. А многія апазіцыянеры не могуць існаваць у калектыве», — заявіла чыноўніца, якая паводле пасады павінна захоўваць нейтральнасць.

Сярод партый найбольшую колькасць вылучэнцаў зрабіла Камуністычная партыя — 700 чалавек. З апазіцыйных — АГП (505).

Ад прафсаюзаў вылучана 10 тысяч прадстаўнікоў, ад «Белай Русі» — 4 300.

### Празрыстых скрыняў не будзе

Місію АБСЕ зноў узначаліць пасол Герт Арэнс. Нямецкі дыпламат ужо працаваў на выбарах у Беларусі ў 2006 і 2008. Тыя выбары былі прызнаныя несвабоднымі. Місія АБСЕ фіксавала шматлікія парушэнні.

Зараз пры ўчастках акрэдытавана 388 назіральнікаў. Ад наступнага тыдня працу ў краіне пачне місія АБСЕ.

Цікава, што місію СНД па Магілёўскай вобласці ўзначальвае Юрый Кулакоўскі. Гэты чалавек быў дэпутатам лукашэнкаўскай палаты прадстаўнікоў. Ярмошына кажа, што гэта не супярэчыць дзейнаму заканадаўству.

А вось дэбаты ў жывым эфіры ўсё ж не плануюцца. Напэўна, Лукашэнка не наважваецца сутыкнуцца ў адкрытай размове з апанентамі.

Што датычыць празрыстых скрыняў, якія прапаноўваў кандыдат Уладзімір Някляеў, то прымаць іх не будуць. «Падчас выбараў не можа аказвацца гуманітарная дапамога з-за мяжы», — кажа Ярмошына.

Тым не менш, яна сцвярджае, што ёсць рэкамендацыя на ўчастках, дзе набываецца новы рыштунак, купляць менавіта празрыстыя скрыні. У Мінску, па яе словах, такіх участкаў досыць шмат.

А што тычыцца словаў Мікалая Лазавіка аб прыёме скрыняў ад Някляева, то адказ быў: «Ён, напэўна, проста пажартаваў».

### «Паказанні Казлова — старая правакацыя»

Былі закранутыя скандальныя паказанні падпалкоўніка міліцыі Мікалая Казлова. Ён сцвярджаў пра фальсіфікацыі на адным з мінскіх участкаў падчас парламенцкіх выбараў-2008.

«Да нас ніхто па факце гэтай публікацыі не звяртаўся. Гэтая публікацыя — старая правакацыя. Паднятая, бо не было ніякіх іншых тэмаў», — сказала Ярмошына, гледзячы проста ў вочы карэспандэнту «Нашай Нівы». Яна зазначыла, што гэты выпадак не ўвайшоў у выніковую справаздачу місіі АБСЕ, а сам Анатоль Лябедзька таксама не вельмі чапляўся за яго, што паказальна.

Была закранутая тэма працягнення супраць спн.Ярмошынай візавых санкцый Еўрасаюзам. «Канечне, стаўлюся адмоўна. Як я яшчэ магу ставіцца?»

**Зміцер Панкавец**

# Кандыдат Правальскі сабраў амаль усе подпісы ў адным раёне Віцебска

Ну, не ўсе. Тысячу сабраў у іншых.

Віцебскі прадпрымальнік Уладзімір Правальскі падаў у выбаркам 109 тысяч подпісаў. Самае цікавае, старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына кажа, што ўсе свае подпісы ён сабраў на тэрыторыі аднаго раёна — Першамайскага ў Віцебску. Агулам там выбарцаў 115 тысяч. Толькі 6 тысяч не падпісаліся.

**«Наша Ніва»: Праўда, што подпісы збіралі толькі ў адным Першамайскім раёне?**

**Уладзімір Правальскі:** Ды не, не праўда. Збіралі яшчэ ў Наваполацку, Полацку, Мёрах, Чыгуначным і Кастрычніцкім раёнах Віцебска.

**«НН»: А дзе найбольшыя паказчыкі?**

**УП:** У Першамайскім. Там сабралі прыкладна 107—108 тысяч.

**«НН»: Ого. І як так выйшла?**

**УП:** Ну, мы, прадпрымальнікі, дзейнічаем так, каб найменш было выдаткаў і атрымаць ад гэтага найбольшы эфект.

**«НН»: Думаеце, Вас зарэгіструюць?**

**УП:** А што тут думаць? Мы выканалі сваю працу. Другога рашэння проста не можа быць.

**«НН»: Разлічваеце перамагчы?**

**УП:** Вядома. Верым у гэта. Узважылі ўсё добра, перад тым як балатавацца. Разумееце, Лукашэнка ўжо састарэў. Людзі хочуць новага.

**«НН»: А сярод апазіцыі добрых кандыдатаў няма?**

**УП:** Яны і называюць сябе апазіцыяй, бо не могуць пахваліцца ніякімі рэальнымі дасягненнямі.

**«НН»: А Вы можаце?**

**УП:** Я найлепшы прадпрымальнік краіны.

**«НН»: Якая ў Вас праграма?**

**УП:** У дзяржаве, каб нармальна функцыянаваць, павінны быць дзве рэчы. Першае – яна павінна ўмець зарабляць грошы. Другое – павінна быць свая мова. У нас няма ні таго, ні другога. Я вырашу гэтыя праблемы.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Уладзімір Правальскі**

нар. 14 студзеня 1959 у вёсцы Сцяпурава (цяпер Сенненскі раён Віцебскай вобласці). Жанаты, мае двух дарослых дзяцей. Пасля заканчэння Віцебскага політэхнічнага тэхнікума (1978) да 1991 працаваў у будаўніцтве. Пачынаў бетоншчыкам, скончыў дырэктарам асацыяцыі будаўнічых кааператываў Віцебскай вобласці. Ад 1991 — індывідуальны прадпрымальнік. Пераможца рэспубліканскага конкурсу «Найлепшы прадпрымальнік 2009 года» ў намінацыі «Найлепшы прадпрымальнік у сферы паслуг».






ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Рыгор Кастусёў з БНФ сабраў 107 тысяч подпісаў.

# Свята дэмакратыі ля ГУМа

«Лукашэнка кажа, што мае мільён подпісаў. Але ў апазіцыйных разам таксама мільён».

«Парад пікетаў» анансаваўся як супольнае мерапрыемства ўсіх дэмакратычных кандыдатаў, якое павінна было завяршыць этап збору подпісаў. Удзел у ім узялі аж пяць з іх: Рыгор Кастусёў, Мікола Статкевіч, Віталь Рымашэўскі, Уладзімір Някляеў і Андрэй Саннікаў.

А 12-й гадзіне 29 кастрычніка пляцоўка ля ГУМа была запоўненая людзьмі, што трымалі разнастайныя плакаты, сцягі ды расцяжкі. Пікетаў было столькі, што размінуцца сярод іх было вельмі складана.

Сярод пікетоўшчыкаў пераважалі прыхільнікі двух кандыдатаў — Уладзіміра Някляева і Андрэя Саннікава. А вось Статкевіч, Рымашэўскі і Кастусёў удзельнічалі ў ім сімвалічна.

Замест Андрэя Саннікава падтрымаць актывістаў «Еўрапейскай Беларусі» спачатку прыехаў Станіслаў Шушкевіч. З'яўленне першага кіраўніка незалежнай Беларусі выклікала сапраўдны фурор сярод мінакоў — ад ахвотных сфатаграфавацца са спадаром Станіславам немагчыма было адбіцца. Неўзабаве падаспеў і сам Саннікаў. Яго адразу атачылі актывісты «Еўрапейскай Беларусі». Даволі нечакана да Саннікава далучыўся Някляеў. Гэта выклікала вялікі ажыятаж ва ўсіх прысутных. Што праўда, кандыдаты размаўлялі адзін з адным нядоўга і ад супольных заяваў устрымаліся.

На вокліч з натоўпу «Калі ж вы ўжо вызначыце адзінага», Андрэй Саннікаў сціпла адказаў: «Адзіны ў нас народ».

Лідар кампаніі «Гавары праўду!» тым часам публічна павіншаваў усіх кандыдатаў, што заявілі аб сабраных ста тысячах:

«Лукашэнка кажа, што мае мільён подпісаў. Але ў нас усіх разам таксама мільён. Мільён чалавек падпісалася за альтэрнатыву».

Эканаміст Сяргей Чалы застаўся акцыяй задаволены: «А што, нармальная акцыя. Даўно нічога такога не было ў нас. Цікава назіраць».

Яшчэ большае здзіўленне выказвалі замежныя журналісты і назіральнікі. Каардынатарка чэшскай арганізацыі «Грамадзянская Беларусь» Катка Шпацава распавяла карэспандэнту «НН», што не чакала пабачыць такія акцыі апазіцыі на вуліцах Мінска. «Гэта ўсё вельмі нечакана для мяне. Добра, што ўлады Беларусі дазволілі апазіцыі больш-менш вольна дзейнічаць».

Уладзімір Някляеў урачыста ўзнагародзіў сваіх актывістаў, якія начавалі ля ГУМа ў намёце, тэрмасамі і дыпломамі, а потым пад воклічы «Жыве Беларусь!» паўдзельнічаў у працэдуры зняцця намёта. Як зазначыў паэт, «з сакральнага для нас месца». Намёт запакавалі ў торбу з надпісам «Паставіць 19 снежня» і ўжо звыкла запрасілі ўсіх на Плошчу.

**Алесь Пілецкі**

# БТ гаворыць пра Лукашэнку ў 1250 разоў болей, чым пра апазіцыю

Праведзены першы этап маніторынгу «Асвятленне прэзідэнцкіх выбараў-2010 у беларускіх СМІ». Пад прыцэлы экспертаў у галіне медыяў трапілі васямнаццаць СМІ, як дзяржаўных, так і недзяржаўных, як папяровых, так і электронных.

### У незалежных СМІ Някляеў на першым месцы

Што датычыць незалежных выданняў, то асаблівых прэтэнзій тут няма. І naviny.by, і «Наша Ніва», і «Народная воля» асвятляюць выбары досыць шматбакова.

Цікава, што ва ўсіх згаданых медыях, у тым ліку і ў «НН», сярод кандыдатаў найбольш пісалі пра Уладзіміра Някляева. Але гэта хутчэй таму, што лідар кампаніі «Гавары праўду» даваў найбольш медыйных нагодаў за іншых прэтэндэнтаў.

А вось «Камсамольская праўда» найбольш увагі надала Аляксандру Лукашэнку. Яму аддадзена 82% газетнай плошчы, што адводзіцца пад выбары. І рэпрэзентаваны ён, асноўным чынам, станоўча. На ўсіх астатніх прэтэндэнтаў набралася ўсяго толькі 18%.

### У 17 разоў меней за спорт

«У дзяржаўных СМІ тэма прэзідэнцкіх выбараў не была прыярытэтнай. Гэта вынікае хоць бы з таго, што сюжэтам на тэму выбараў адводзілася ў 2-3 разы меней часу, чым надвор'ю і ў 17 разоў меней, чым спорту», — кажа адзін з каардынатараў маніторынгу філосаф Алесь Анціпенка.

Дзяржаўныя СМІ амаль не падавалі матэрыялаў, прысвечаных збору подпісаў. А калі нешта і праслізгвала, то дамінаваў іранічна-прыніжальны тон ды ўжываліся абразлівыя параўнанні.

Апроч Лукашэнкі, дзяржаўныя СМІ таксама асвятлялі дзейнасць ЦВК, назіральнікаў. Гэта падавалася ў нейтральным святле.

«Дзяржаўныя выданні змяшчалі матэрыялы, якія стваралі ўражанне прадвызначанасці выбараў», — кажа А.Анціпенка.

### «Панарама» адводзіць на выбары 0,86% часу

Вечаровая навіновая праграма «Панарама» на тэлеканале БТ тэме прэзідэнцкіх выбараў адвяла ўсяго толькі 0,86% эфірнага часу.

Аляксандру Лукашэнку выдзяляецца 75% часу. Згадкі пра іншых кандыдатаў былі па некалькі секунд. Так, былі імгненныя нагадванні пра кандыдатаў Някляева і Правальскага. Але гэта 0,01% часу. То бок пра Лукашэнку ў «Панараме» расказваюць у 1250 разоў болей.

На АНТ і Першым канале радыё Лукашэнка таксама займае 70 і 80% часу адпаведна. На АНТ адзін раз (!) згадвалі Раманчука і Рыжова.

А вось «Советская Белоруссія» аддала апазіцыі аж 13,6% плошчы. Што праўда, гаворка пра апазіцыю зусім не персаніфікаваная і амаль заўсёды негатыўная. Вылучыць некага з кандыдатаў немагчыма.

Уявіць сабе такую карціну дзесьці ў краінах Еўрасаюза немагчыма. Там напярэдадні выбараў СМІ імкнуцца даваць аднолькавую інфармацыю пра ўсіх магчымых кандыдатаў.

**Зміцер Панкавец**

**Пра каго пісала «Наша Ніва» ад 11 да 30 кастрычніка (плошча матэрыялаў у квадратных сантыметрах):**

Уладзімір Някляеў — 29,3%;

Дзмітрый Ус — 8,5%;

Рыгор Кастусёў — 7,8%;

Яраслаў Раманчук — 7,1%;

Алесь Міхалевіч — 3,5%;

Аляксандр Лукашэнка — 2,8%;

Сяргей Рыжоў — 0,6%;

Андрэй Саннікаў — 0,08%;

Мікола Статкевіч — 0,03%;

Пятро Барысаў — 0,01%;

Віктар Цярэшчанка — 0,01%.

**Крыніца:** Маніторынг БАЖ. Някляеў і Ус выйшлі на першае месца, бо акурат у гэтых нумарах публікавалася двухпалосная гутарка «У гасцях у кандыдата» з першым і паласная гутарка з другім. Аналагічныя інтэрв'ю з іншымі кандыдатамі публікаваліся ў папярэдніх нумарах.

### «Рыжы, рыжы, канапаты, зняўся з гонкі кандыдатаў».

«Рыжы, рыжы, канапаты, зняўся з гонкі кандыдатаў», — так тэлеканал АНТ пракаментаваў рашэнне Сяргея Рыжова спыніць удзел у прэзідэнцкіх выбарах.




**Лідар Зялёных стаў адзіным кандыдатам у прэзідэнты, які адкрыта прызнаў: не здолеў сабраць подпісы. Гутарка з Юрыем Глушаковым — чытайце на сайце «Нашай Нівы» NN.BY.**

# Някляеў гатовы саступіць нафтаправоды і заводы Расіі

Лідар «Гавары праўду» прэзентаваў сваю замежнапалітычную праграму.

Як адзначыў Някляеў, з улікам таго інтарэсу, які выказвае Расія да транзітнага і нафтаперапрацоўчага комплексу Беларусі, шмат у каго з'яўляецца ўражанне, што прыватызацыя буйных прадпрыемстваў пагражае нацыянальнай бяспецы краіны.

«Мы не можам выключыць расійскі капітал з такой умовай, хочам мы яго ўспрымаць тут або не. Ён існуе, і ён такі, які ён ёсць. Трэба проста дакладна вызначыцца, што яму тут рабіць. Для мяне ёсць ясны адказ на гэтае пытанне. Расійскі капітал павінен скупляць тут тое, што і так, па сутнасці, залежыць ад Расіі. І што, па вялікім рахунку, акрамя Расіі, нікому не трэба», — заявіў Някляеў.

У якасці прыкладу ён прывёў нафтаправоды, якія, паводле яго слоў, патрабуюць «капітальнага рамонту, на які ў Беларусі няма грошай». «Тое, што яны патрэбныя Захаду, я магу ўявіць толькі ў адным выпадку: калі нейкі спекулянт на Захадзе павыкупляе гэтыя прадуктаправоды і прадасць іх назад Расіі», — сказаў палітык.

«Тыя ж нафтаперапрацоўчыя заводы, якія працуюць на расійскай сыравіне. Калі расійскія кампаніі ўвойдуць туды як уласнікі, то з імі можна будзе лягчэй весці перамовы, лягчэй вырашаць пытанні, якія на сённяшні дзень не вырашаюцца», — адзначыў Някляеў.

Кіраўнік выбарчага штаба Някляева Андрэй Дзмітрыеў адзначыў, што цяпер капітал не мае нацыянальнай прыналежнасці:

«Калі нават хтосьці сёння прыватызуе трубапровод з Германіі або Вялікабрытаніі, то гэта не значыць, што гэта быў не расійскі капітал, вывезены за мяжу».

Акрамя таго, як адзначыла палітолаг Святлана Навумава, расійскі капітал, які можа прыйсці ў Беларусь, не абавязкова будзе алігархічным.

«У Расіі з'явілася «другая хваля» прадпрымальнікаў і бізнесменаў, якія маюць намер весці свой бізнес празрыста і адкрыта», — адзначыла яна.

**БелаПАН**

## Андрэй Саннікаў: Я б хацеў перш даведацца, хто сапраўды набраў 100 тысяч

Каардынатар «Еўрапейскай Беларусі» Андрэй Саннікаў пра магчымасць вылучэння адзінага кандыдата ад апазіцыі.

**«Наша Ніва»: Якая можа быць тактыка апазіцыйных кандыдатаў на наступным этапе выбарчай кампаніі?**

**Андрэй Саннікаў:** Ведаеце, я б хацеў перш даведацца, хто сапраўды набраў гэтыя 100 тысяч подпісаў. Не ўпэўнены, што ўсе змаглі справіцца з гэтай працай. Але я лічу, што вялікая колькасць прэтэндэнтаў з выразнай альтэрнатывай ішло на карысць.

**«НН»: Дык адзіны трэба ці не?**

**АС:** Я не бачу такой неабходнасці. Трэба неяк каардынаваць сумесныя дзеянні. Сітуацыя ж сама будзе дыктаваць нам план працы.

**«НН»: А вялікая колькасць кандыдатаў на карысць апазіцыі ці ўладзе?**

**АС:** Ведаеце, калі 6-7 апазіцыйных кандыдатаў атрымаюць гадзіну гарантаванага эфірнага часу на тэлебачанні, то гэта добра. Звароты праз ТБ будуць спрыяць мабілізацыі людзей.

**Гутарыў ЗП**

## Мільён за Лукашэнку і мільён за апазіцыю

Але якія гэта мільёны?

Паводле звестак Цэнтрвыбаркама, за Лукашэнку паставілі свае подпісы каля 1100 тысяч выбарцаў. Прыкладна столькі ж подпісаў здалі 9 апазіцыйных, без уліку Цярэшчанкі, кандыдатаў.

За Лукашэнку прымусам падпісвалі на прадпрыемствах і ва ўстановах. Добра, калі палавіна ад мільёна аддала свой голас добраахвотна.

А за апазіцыю падпісваліся па сваёй волі. Аднак большасць апазіцыйна настроеных грамадзян падпісваліся адначасова за некалькі апазіцыйных кандыдатаў, за ўсіх, хто быў у дасяжнасці. Так што пратэставы электарат таксама невялікі.

Што маем у чыстым выніку?

Паўмільёна чалавек выказаліся за аўтарытарызм і паўмільёна — за дэмакратыю. 10% палітычна актыўнага насельніцтва падзяліліся пароўну.

Пабачым, што памяняе ў галовах месяц палітычнай агітацыі з тэлевыступамі.

**Андрэй Дынько**

## Лукашэнка: «Беларусы ніколі не жылі так добра»

бо ў СССР з беларусаў выціскалі ўсё.

Пра гэта Аляксандр Лукашэнка сказаў у інтэрв'ю газеце «Літовскій кур'ер».

«Беларусы яшчэ ніколі так не жылі, як жывуць цяпер. Аб гэтым мне і мая маці кажа. Бо з беларусаў выціскалі ўсё. Мы кармілі Піцер, Маскву, палову Расіі.

І нашы кіраўнікі ў Беларусі, можа, як і ў Літве, атрымлівалі зоркі за тое, што больш туды аддадуць. Так, мы сёння ў цяжкіх умовах працуем, але маем магчымасць карыстацца тым, што мы зарабілі. Мы самастойныя ў прыняцці рашэння».

**МБ**

### Сцісла

• **Някляеў хоча трапіць на Усебеларускі хурал.** Ён сабраў 302 жыхароў Ленінскага раёна сталіцы ў двары дома №4, корпус 1 на праспекце Ракасоўскага. Гэты сході вылучыў палітыка на лукашэнкаўскі сход.

• **Лукашэнка: я ніколі не дазволю сабе фальсіфікаваць выбары.** Такую заяву ён зрабіў у Брэсце. Паводле яго слоў, «мы многага не зрабілі, але мы зрабілі больш, чым іншыя».

• **«Пікет памяці» прайшоў 29 кастрычніка ля будынка КДБ.** На яго прыйшлі пяцёра кандыдатаў у прэзідэнты. Удзельнікі са свечкамі ў руках ушаноўвалі памяць расстраляных у гэты дзень у 1937 годзе ста прадстаўнікоў нацыянальнай эліты. Арганізатарам мерапрыемства быў кандыдат у прэзідэнты ад Партыі БНФ Рыгор Кастусёў.

• **Экс-прэтэндэнта ў прэзідэнты звольнілі з працы.** Сяргей Рыжоў, які не сабраў 100 тысяч подпісаў, атрымаў загад на звальненне. Спадара Рыжова звольнілі нібыта за прагул.

**ЗП**

# $1,4 мільярда на стадыёны

Столькі каштуе рэканструкцыя старых і будаўніцтва новых футбольных стадыёнаў у сталіцы.

Услед за «хакеізацыяй» краіны ўлады пачынаюць курс на «футбалізацыю» сталіцы.

У бліжэйшыя два-тры гады ў Мінску павінны быць пабудаваныя тры новыя стадыёны і рэканструяваны чацвёрты. І калі на ўзвядзенне яшчэ адной арэны, у Барысаве, мяркуецца выдаткаваць параўнальна няшмат, 20 мільёнаў еўра, іншыя стадыёны каштуць на парадак больш.

Самай дарагой ідэяй застаецца праект літоўскага мільянера Уладзіміра Раманава. На месцы цяперашняга стадыёна «Трактар» ён абяцаў узвесці новую арэну, якая б магла змясціць 18 тысяч гледачоў, і рэканструяваць той стадыён, што ўжо існуе. Інвестыцыйная дамова была падпісаная ў далёкім 2007 годзе. Па першасных падліках, кошт праекта ацэньваўся ў $700—750 мільёнаў. Яго павінна рэалізоўваць сумесная беларуска-літоўская кампанія «Стадыум». У сакавіку 2010 года Мінгарвыканкам выступіў з прапановай — карэнным чынам змяніць праект і пабудаваць 45-тысячны стадыён. Літоўцы былі вымушаныя згадзіцца з прапановай, праўда, папрасілі дадатковы час на абнаўленне праекта і ўнясенне зменаў у дакументацыю.

Але пакуль інвестары рыхтаваліся, Мінгарвыканкам... у чарговы раз передумаў! Мінскія ўлады канчаткова вырашалі будаваць 18-тысячную арэну. Нягледзячы на паўгадавую затрымку, выкліканую няпэўнасцю, тэрміны рэалізацыі праекта засталіся ранейшымі. Стадыён мусіць быць адкрыты ў 2012 годзе.

Нацыянальны стадыён у Шчомысліцы, што знаходзіцца за некалькі кіламетраў ад Мінскай кальцавой, ацэньваецца крыху менш — «усяго» на $500 мільёнаў. Кошт праекта аказаўся нечакана высокім, нягледзячы на тое, што ўсе працы выканаюць беларусы. За гэтыя грошы будуць пабудаваныя як футбольны стадыён, так і дадатковыя аб'екты — гандлёвыя цэнтры, рэстараны і нават верталётная пляцоўка. Праект ужо трапіў у інвестыцыйны атлас сталіцы. Паколькі гэткі дарагі праект немагчыма прафінансаваць з гарадскога бюджэту, хутчэй за ўсё, спатрэбіцца крэдыт аднога з нямецкіх банкаў.

Для параўнання, Алімпійскі стадыён у Пекіне каштаваў $425 мільёнаў. Але і змяшчае аж 100 тысяч гледачоў!

Нарэшце, у рэканструкцыю стадыёна «Дынама» плануецца ўкласці $150 мільёнаў. На футбольным полі ўсталююць разборную сцэну для правядзення канцэртаў, а непадалёк пабудуюць спартова-аздараўленчы і гандлёвы цэнтр.



На месцы «Трактара» пабудуюць і гатэль, і бізнэс-цэнтр, і два стадыёны.

Першасны кошт праектаў складае $1,4 мільярда, падчас будаўніцтва ён будзе павялічвацца яшчэ і яшчэ. Пры аналізе гэтых лічбаў становіцца зразумелым, што ўзвядзенне Нацыянальнай бібліятэкі ці іншыя «будоўлі стагоддзя» сталі не такімі ўжо моцнымі ўдарамі па эканоміцы. Напрыклад, за бібліятэку беларусы заплацілі $150 мільёнаў, у 10 разоў менш, чым за стадыёны.

**Яўген Васількоў**

# За эканамічныя злачынствы не арыштуюць да рашэння суда

Стаў вядомы праект дырэктывы «Аб лібералізацыі эканомікі».

Яшчэ ў красавіку гэтага года кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка загадаў падрыхтаваць праект дырэктывы №4 «Аб лібералізацыі эканомікі», якая б унесла радыкальныя змены ў жыццё бізнэсу. Праца працягваецца ўжо больш за паўгода і, здаецца, блізкая да завяршэння. Намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур абяцае, што дакумент будзе прыняты да прэзідэнцкіх выбараў.

Тым часам грамадскасці сталі вядомыя новыя падрабязнасці дакумента. У ім прадугледжана, што новыя законы, дэкрэты і інструкцыі будуць уступаць у сілу праз тры месяцы пасля прыняцця. Бізнэс павінен мець час, каб падрыхтавацца да новых правілаў гульні. Дакументы перастануць прымацца папярэдняй датай і не будуць мець зваротнай сілы.

Дзяржава нарэшце заклапацілася пралёс «шэрых» мільёнаў і мільярдаў. Да 1 ліпеня 2011 года прапануецца скласці дакумент наконт падатковай амністыі. Мяркуецца, што, калі нядобрасумленны бізнэсоўца пагодзіцца выплаціць падаткі з нелегальных прыбыткаў, ён зможа легалізаваць свае грошы. На думку незалежных экспертаў, вышэйшае кіраўніцтва краіны мае ў гэтым уласны інтарэс. «На мой погляд, 90% беларускага бізнэсу, які не мае патрэбных сувязяў, валодае ўсяго 10% капіталу, які трэба легалізаваць», — мяркуе эканаміст Міхась Залескі. Летась такая ж праграма абвяшчалася ў Італіі. Тады за тры месяцы было легалізавана амаль $100 мільярдаў. Узровень крымінальнасці і карумпаванасці ў Італіі нашмат вышэйшы за беларускі, але і наш бюджэт можа разлічваць на неспадзяваныя прыбыткі.

Іншае юрыдычнае ноу-хау датычыць умоваў утрымання падазраванага. Цяпер, калі чалавек здзейсніў эканамічнае злачынства, яго не будуць арыштоўваць да таго часу, пакуль не будзе вынесена рашэнне суда. Раней жа яго маглі адразу змясціць пад варту, дзе часцяком «выціскалі» патрэбныя паказанні. Калі ж кімсьці былі здзейсненыя адміністратыўныя правапарушэнні, якімі б цяжкімі яны ні былі, будзе забаронена канфіскоўваць ягоную маёмасць.

Што датычыць лібералізацыі менавіта эканомікі, то тут прадугледжваецца далейшае свабоднае цэнаўтварэнне. Спіс «святых кароў», якія не павінны даражаць, будзе скарачацца.

Павінна знікнуць і дзяржаўная манаполія на абавязковае страхаванне. Гэтым дазволяць займацца прыватнікам.

Улады прыслухаліся далёка не да ўсіх прапаноў бізнэсоўцаў. Але індывідуальным прадпрымальнікам так і не дазволілі наймаць на працу не толькі сваякоў. Пакуль краіна яшчэ была на дне крызісу, улады ўсяляк дэкларавалі гатоўнасць вярнуць ІПэшнікам такое права. Цяпер ад ідэі зноў адмовіліся, бо яна дазваляла б сярэдняму бізнэсу сыходзіць ад падаткаў.

**ЯВ**

# Дзеці так і не атрымалі ад прэзідэнта адказаў на свае пытанні

У маі мінулага навучальнага года па ўсёй краіне праходзіла акцыя «Задай пытанне прэзідэнту», арганізаваная БРСМ.

Дзецям ва ўсіх навучальных установах прапаноўвалася напісаць ліст прэзідэнту Лукашэнку і задаць пытанні, якія іх цікавяць і хвалююць. Цікава, што акцыя была арганізавана адразу пасля таго, як аналагічную ідэю рэалізавала кампанія «Гавары праўду».

Многія з дзіцячай непасрэднасцю адгукнуліся і напісалі. Пыталіся пра рознае: напрыклад, у класе маёй дачкі былі пытанні аб самым яркім дзіцячым уражанні прэзідэнта, аб тым, як ён уяўляе будучыню Беларусі, а адзін хлопчык запытаўся, калі будзе вернуты бел-чырвона-белы сцяг...

Не прайшло і паўгода, як БРСМ правяло чарговую акцыю — дзецям, якія задалі «найлепшыя» пытанні, паведамілі, што яны атрымаюць адказ ад Лукашэнкі. Гэта выклікала пэўнае ўзрушэнне!

Адказы ўручаліся на наступны дзень на адмысловых зборах, на якіх прадстаўнікі ўлады і БРСМ дзякавалі дзецям за актыўнасць і падкрэслівалі, што ўлада прыслухоўваецца да народа, рэагуе на ўсе пытанні.

Сам «адказ» уяўляе сабой папку, на вокладцы якой размешчаны надпіс «Молодость моя» і выявы значкоў «ВЛКСМ» і «БРСМ». Унутры — рэкламны буклет з такой самай назвай, дыск з відэа «Жизнь красивую прожіть», зборнік песень «Молодость моя» і фотамазаіка з такой самай назвай, карты абласцей Беларусі, а таксама сам «ліст ад прэзідэнта» — аддрукаваны друкарскім спосабам тэкст на расейскай мове, аднолькавы для ўсіх, у якім, у прыватнасці, прэзідэнт дзякуе ўдзельнікам акцыі за тое, што яны «нераўнадушна глядзяць на тое, што адбываецца вакол», запэўнівае, што «пытанні ўдзельнікаў акцыі не застануцца без увагі», жадае «моцнага здароўя, поспехаў у вучобе» і заклікае: «Будзь адважным, ствараў, імкніся да новых вяршыняў!»

Словам, так і не атрымалі дзеці адказаў на свае пытанні, не даведаліся, якімі былі дзіцячыя ўражанні Лукашэнкі, як ён уяўляе будучыню і калі верне нацыянальны сцяг...

Цікава таксама, як адбіраліся тыя з дзяцей, каму ўручаўся гэты «адказ». У нашым класе гэта аказаліся першыя і апошнія па класным спісе...

**Наталля Бабіна**

## СЦІСЛА

• **Цягнікі ў метро будуць хадзіць часцей.** З 1 лістапада скароціцца інтэрвал руху на Аўтазаводскай лініі ў гадзіны пік.

• **Змяняюцца ўмовы пастаноўкі на ўлік для паляпшэння жылля.** Так, будзе ўлічвацца метраж жылплошчы не толькі пэўнага грамадзяніна, але і жылплошчы ва ўласнасці ягоных сямейнікаў, якія жывуць разам з ім.

• **З падставы для пастаноўкі на ўлік грамадзян выключаюцца разведзеныя, якія забяспечаны жылплошчай больш за вызначаны парог у 15 кв. м на чалавека.** А грамадзяне, якім выдзелены па-за аўкцыёнам пляц для будаўніцтва, страцяць права адначасова ўступаць у ЖБК для будаўніцтва льготнага жылля і наадварот.

**МБ**

# Ахвяра псіхіятрычных Курапат

**Пісьменнік Алесь Наўроцкі «знік» у канцы 1970–х, калі са скандалам выйшаў з Саюза пісьменнікаў. Адны яго даўно пахавалі, а для іншых ён застаецца загадкай і да сёння.**

Алесь Наўроцкі нарадзіўся ў 1937 годзе ў сям'і настаўнікаў. Скончыў Бабруйскую школу санітарных фельчараў. Вышэйшую адукацыю атрымаў у Мінскім медыцынскім інстытуце. Тры гады працаваў лекарам участковай бальніцы на Хойнічшчыне.

Як заканчваў Медінстытут, выйшаў яго першы зборнік вершаў «Неба ўсміхаецца маланкаю» (1962). Невялікая кніга нарабіла шмат шуму, выхаду якому ў шырокія колы пастараліся не даваць. Сам аўтар не ахвочы ўспамінаць тую гісторыю.

«Гэта быў свежы голас у паэзіі. Для мяне ён быў і застаецца выдатным паэтам», — кажа рэдактар таго зборніка Васіль Сёмуха.

За той зборнік, успомніўшы і іншы грэх — выданне кнігі Караткевіча, Сёмуху звольнілі з працы. Але ён не шкадуе, што дапамог паэту з кнігай, пры выданні якой прыйшлося пайсці на пэўныя хітрыкі.

Што ж было такога страшнага ў «Небе...»? 25-гадовага хлапца абвінавацілі ў антысаветчыне. У яго вершах разглядзелі пародыю на савецкую ўладу.

«Спеў салаўя заглушае кваканне жаб», — у гэтым двухсэнсоўным радку крытыкі ў цывільным расчыталі палітычны падтэкст. Альбо:

Гаварыў з трыбуны аднойчы Нос:
«…Кармавыя адзінкі кукурузы, аўса…»
«…Гавораць факты, што мы дагонім…»
Кожнае слова, нібы парашок снатворны, —
Усе пачалі засыпаць.
І раптам…
І раптам да Носа падкраўся вецер,
Лісткі прамовы схапіў і панёс.
Аб чым гаварыць? Нос разгубіўся.
Ну ж і браўся за жывот натоўп ад смеху!

А гэта ж быў 1962 год — кіраўніком тады быў Мікіта Хрушчоў.

За кнігу ў Саюзе пісьменнікаў аўтара паганілі. Але і забыліся. Успомнілі пра той агрэх пазней, калі ён пачаў выяўляць грамадзянскую пазіцыю.

Практыкуючы медык, Наўроцкі сутыкаўся з тым, што людзей па палітычных мэтах адпраўлялі ў псіхіятрычныя лякарні. Ён адкрыта выступаў супраць падобных метадаў, за што адразу быў узяты пад нагляд спецорганамі.

Пасля скандальнага зборніка Алесь Наўроцкі перабраўся ў сталіцу, дзе працаваў на Мінскай станцыі хуткай медыцынскай дапамогі. Але не заладзілася сямейнае жыццё: паэт разышоўся з жонкай і паступіў на Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве.

Па яго словах, менавіта тады і пачаўся адкрыты пераслед. Паэт, які застаўся адзін, далёка ад родных, стаў зручнай мішэнню. Спецслужбы пачалі «псіхіятрычны шантаж». Алесь Наўроцкі апускае вочы, калі распавядае аб гэтым. Але размовы не спыняе.

«На літкурсах кожны жыў у асобным пакоі. І ў мой пакой пачалі пранікаць і перакладаць рэчы, забіваць цвікі ў сцены. Першай такой рэччу была папруга. Яе выцягнулі са штаноў і паклалі на ложку. Калі я вярнуўся і ўбачыў такое, мяне скаланула. І так працягвалася нейкі перыяд. Вучыцца далей я не мог. Падаў заяву аб сыходзе. Але прычыны не ўказаў, бо тады б мяне пацягнулі ў псіхлякарню. Гэта і ёсць псіхіятрычны шантаж».

У лякарню паэта ўсё-ткі адправілі.

Прафесар Адам Мальдзіс распавядае, што тады ён не паверыў у хваробу Наўроцкага. Ведаў, што падобныя чуткі запусцілі наўмысна.

А сам паэт у знак пратэсту супраць прымянення псіхіятрыі ў палітычных мэтах у 1976 годзе выйшаў з Саюза пісьменнікаў.

«Па тым часе гэты быў вялікі галаўны боль для кіраўніцтва арганізацыі. Мне гаварылі так: забяры гэты пратэст, не выходзь з Саюза пісьменнікаў і будзеш працаваць далей. Толькі не падымай шуму. А я на гэта не пагадзіўся. Настолькі мне было агідна не заявіць гэты пратэст. Прамаўчаць — значыць згадзіцца, што яны цягнуць здаровых людзей у псіхарні. Я сказаў намесніку старшыні СП Шамякіну, што не магу насіць гэтую подласць у сабе».

Як вярнуўся ў Мінск з Масквы, працаваць урачом Алесю Наўроцкаму не дазволілі. Не давалі нават фізічнай працы — грузчыкам. На непрацяглы перыяд атрымалася вярнуцца на хуткую дапамогу. Але «прымацавалі мяне да псіханеўралагічнага дыспансера».

Ясная справа, што творы пісьменніка перасталі выдаваць. «Чалавека, якога яны бяруць пад каўпак, больш не публікуюць. Надрукаваць — гэта даць сродкі для жыцця. А яны не зацікаўленыя ў тым. Рукапіс кнігі апавяданняў «Валун» я разы чатыры падаваў у выдавецтва, перш чым яна прабілася. Думалі, што спачатку зробяць мяне сексотам, а пасля пачнуць друкаваць. Але не ўдалося».

Як жыў паэт увесь гэты час? Дапамагала маці: яна са сваёй пенсіі пэўную суму штомесяц адсылала сыну. Гэтага было дастаткова толькі, каб не сканаць з голаду. Ад роспачы Наўроцкі спрабаваў нават дабіцца дазволу выехаць за мяжу. У СССР гэта было надзвычай цяжка. Не выпусцілі. Маўляў, для гэтага павінен быць выклік з-за мяжы ад сваякоў. Сваякоў такіх не было. І працягвалася нямое супрацьстаянне.

Толькі ў гады перабудовы Наўроцкі голасна расказаў аб сваёй трагедыі. Паэт выступіў на з'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі ў 1990-м. Алесь Наўроцкі патрабаваў ад уладаў палітычнай рэабілітацыі.

На перабудову ён ускладаў спадзяванні. «Самыя смелыя спраўдзіліся — Беларусь стала незалежнай». Але асабіста для паэта 90-я не прынеслі вялікіх зрухаў.

У 1990-м выдалі томік яго паэзіі за дваццаць гадоў «Пакаленні і папялішчы». У 1994-м выйшаў расейскамоўны раман «Валун» (у 1976 пад такой самай назвай ён выдаў зборнік апавяданняў). Парасейску пачаў пісаць, бо думаў «апублікавацца на Захадзе, калі тут не ўдаецца». І зноў маўчанне. Спрабаваў надрукаваць яшчэ новы раман, але ў рэдакцыі аднаго часопіса адмовілі, не ўзяло і дзяржвыдавецтва. Глухая сцяна, падобная да той, савецкай. Толькі без «катаў у белых халатах».

Алесь Наўроцкі расказвае аб сваёй творчай спадчыне. «Я цяпер займаюся тым, што пішу вершы. Хачу трошкі напісаць новых. Тыя, што ў мяне кепскія, выкіну». Ён марыць выдаць двухтомнік паэзіі і распачаць працу над шасцітомнікам прозы. І зачытвае ўрыўкі з неапублікаванай паэмы «Я патрабую палітычнай рэабілітацыі!», якую лічыць лепшай за «Новую зямлю».

«Я патрабую, каб КДБ прызнаўся, што гэта ён нацкаваў дактароў. Што гэта не медыцынская хвароба, а палітычная справа. Паэму «Я патрабую палітычнай рэабілітацыі!», калі атрымаю яе, назаву «Псіхіятрычнымі Курапатамі». Паэма аб тым, як «здаровага чалавека кінулі ў псіхлякарню».

**Сяргей Макарэвіч**




**Алесь Наўроцкі**

нарадзіўся 12 лютага 1937 у вёсцы Давыдаўка Светлагорскага раёна. Па адукацыі — медык. Аўтар шэрага кніг паэзіі і прозы. У знак пратэсту супраць ужыцця псіхіятрыі ў палітычных мэтах выйшаў з Саюза пісьменнікаў. Застаўшыся без сродкаў да існавання, працягваў пісаць у стол.

**Алесь Наўроцкі быў не адзіным**

чалавекам, які за сваю грамадзянскую пазіцыю трапіў у псіхіятрычную лякарню.

Да яго такі метад ізалявання актыўных грамадзян паспыталі на сабе мастак з Пастаўшчыны Вітаўт Дзіско (адкрыта выказваўся супраць савецкага рэжыму; у выніку быў забіты), гісторык Анатоль Сідарэвіч (пратэставаў супраць уводу савецкіх войскаў у Чэхаславакію), праваабаронца з Бабруйска Міхась Кукабака (адмовіўся супрацоўнічаць з КДБ у справе фальсіфікацыі кампрамату на заходненямецкага дыпламата; за два гады да гэтага, у 1968, адмовіўся быць «саўдзельнікам злачынства савецкага ўрада» ў Чэхаславакіі, калі яго туды накіруюць).

Існуюць іншыя прыклады пакарання дысідэнтаў. Адным не давалі магчымасці працаваць па спецыяльнасці (Міхась Чарняўскі, Фёдар Яфімаў, Зянон Пазняк), іншых садзілі ў турму (Мікалай Лагодзіч) альбо забівалі з інсцэніроўкай выпадковага здарэння ці самазабойства (Міхал Баразна).

## АЛЕСЬ НАЎРОЦКІ

САМНОЙ ТЫ…

Ідзеш ты са мною ў мроях.
Вее ўзвей–санцавей.
Заснулі на грушавай кроне
белыя статкі гусей.

Са мной ты… Зялёныя далі.
Сінее возерам лён.
Жытоў фіялетавых хвалі
бягуць, бягуць наўздагон.

Са мной ты… А птах на буслянцы
стаіць на адной назе.
Жук вадзяны па глянцы,
кругі пусціўшы, паўзе.

Са мной ты… А далі азяблі.
Згалела голле асін.
Вясёлка засыпала граблі.
— Курлы! — зажурыўся клін.

Са мной ты… Бялее даліна.
Спіць белы густы навес.
Па сіне–малочнай пярыне
лыжня прастрэліла лес.

Са мной ты… Са мной ты ўсюды —
і на працы, і ў сне…
Са мной ты ўсюды, заўсёды.
……………………………
Ды будзеш належаць не мне.

**Мінск, 2010**

## Сцісла

• **Ганаровым госцем на «Лістапад» запрошаны Вахтанг Кікабідзэ.**

Найбуйнейшы беларускі кінафестываль адчыняецца ў беларускай сталіцы.

Кікабідзэ стаў персона нон грата для Расіі, пасля таго як раскрытыкаваў увод расійскіх войскаў у Паўднёвую Асецію і Абхазію ў 2008 годзе. Пасля той вайны Вахтанг Кікабідзэ адмовіўся прыняць з рук расійскага прэзідэнта Дзмітрыя Мядведзева расійскі Ордэн Сяброўства.

Кікабідзэ адказаў на тую вайну поўнай горычы песняй-зваротам да расейскіх сяброў «Вы мне не здрадзілі — расчаравалі».

У кліпе да яе выкарыстоўваюцца кадры з хронікі канфлікту: расійскія самалёты бамбяць Грузію і Асецію. У чаргаванні з імі ідуць кадры культурнай хронікі СССР, дзе Міхаіл Дудзін, Бэла Ахмадуліна, Андрэй Вазнясенскі чытаюць свае вершы пра Грузію. Своеасаблівым эпіграфам кліпа служыць аўтограф Яўгена Еўтушэнкі «Про Грузию забыв неосторожно, поэтом быть в России невозможно».

Спявак дагэтуль не выступае на тэрыторыі Расіі.



• **Кнігу Бахарэвіча выдалі ў Германіі.**

«Сарока на шыбеніцы» выйшла ў нямецкім выдавецтве Leipziger Literaturverlag. Пераклаў раман Томас Вайлер.

Сёння аўтар працуе над «Малой медычнай энцыклапедыяй Бахарэвіча», артыкулы да якой публікуюцца на сайце радыё «Свабода». Жыве Бахарэвіч у Гамбургу (Германія).




**МБ**

## ГРЭГЕРЫ

### Адам Глобус пра выбары і радзіму

Радзіма там, дзе ты перажываеш за паводзіны кандыдатаў у прэзідэнты.

**adam-hlobus.livejournal.com**

Арсень Ліс. Gloria victis!

750 старонак гісторыі нацыятварэння.




Шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў.

# Частка XIII. Вяртанне дынастыі

Піша **Алег Дзярновіч**.

Працяг. Пачатак у №26, 28, 30, 39, 47 за 2009 год, №7, 22, 27, 29, 32, 34, 39 за 2010 год.

## Напаўвысылка

Усё паданне пра Рагнеду прасякнутае сімвалізмам. Пасля няўдалага замаху на Уладзіміра, паводле звычаёвага права таго часу, князь збіраўся пакараць смерцю ўпартую жонку, узятую такім гвалтоўным чынам. Паводле летапіснага паведамлення, кіеўскі князь загадаў Рагнедзе апрануцца ў святочны строй («як жа ў дзень пасада [вяселля] яе») ды сесці ў доме на ложку — а Уладзімір прыйдзе забіць яе. Рагнеда так і зрабіла, але яна таксама ўклала аголены меч у рукі свайго сына Ізяслава. Сутыкнуўшыся з падобнай дэманстрацыяй, Уладзімір прамовіў: «Хто ведаў, што ты тут» ды адкінуў свой меч.

Далей паданне паведамляе, што баяры, да якіх звярнуўся кіеўскі князь па раду, параілі Уладзіміру не забіваць Рагнеду дзеля іхняга сына ды аднавіць яе вотчыну — Полацкае княства. Не да канца зразумела, навошта. Хоць, несумненна,



Помнік Рагнедзе ў Заслаўі.

перадача той ці іншай зямлі пярэстай «імперыі Рурыкавічаў» прадугледжвала захаванне яе пад уладай роду. Землі проста пераходзілі з рук у рукі розных адгалінаванняў вялікакняскай сям’і. Дый Уладзімір, паслухаўшы рады баяраў, зрабіў пасвойму: не забіў Рагнеду, але і бацькаву вотчыну вярнуў ён не адразу і не цалкам.

У гістарычнай літаратуры пашыраны стэрэатып, нібыта высылка Рагнеды з Ізяславам у Заслаўе была ледзь не актам аднаўлення незалежнасці Полацкай зямлі. Між тым, месцам напаўзняволення Рагнеды і Ізяслава быў абраны новазбудаваны замачак на самым поўдні крывіцкага абшару, але ўсё ж цалкам падкантрольны Кіеву — Ізяслаў, так і названы ў гонар сына кіеўскага князя.

Фактычна, рыхтуючыся да шлюбу з візантыйскай царэўнай, Уладзімір адаслаў Рагнеду са старэйшым сынам у найаддалены ад Кіева куток. Аднаўленне ж самастойнасці Полаччыны — заслуга ў большай ступені нашчадкаў Ізяслава.

Як давёў беларускі археолаг Юры Заяц, на месцы сучаснага Заслаўя яшчэ ў сярэдзіне X ст. узнік пагост — так у той час называлі адміністратыўна-гаспадарчыя пункты кіеўскіх князёў, дзе быў размешчаны іхні гарнізон і куды паступала даніна на карысць Кіева. А насупраць, на правым беразе Свіслачы, месцілася неўмацаванае паселішча крывічоў. Суседняя ж Менская воласць, паўночная частка дрыгавіцкай тэрыторыі, цалкам знаходзілася ў валоданні кіеўскага князя ды была перададзена Полацку толькі ў 1024 г.

У Заслаўе, пад нагляд сваёй дружыны, у замак формы амаль правільнага кола, вядомы ў літаратуры як гарадзішча «Замэчак», Уладзімір і адаслаў жонку і сына, нашчадкаў полацкай дзяржаўнасці.

Хрысціўся Ізяслаў, праўдападобна, разам з іншымі сынамі Уладзіміра. Пра дзейнасць яго ў Полацку хронікі не захавалі звестак. Адзін з пазнейшых летапісаў, Ніканаўскі, дае наступную характарыстыку гэтаму полацкаму князю: «быў жа той князь ціхі, і рахманы, і міласцівы,... і доўгацярплівы». Праўдападобна, вялікі ўплыў на свайго сына мела Рагнеда, у тым ліку і ў пытаннях хрысціянскай веры. Паданне гаворыць, што Рагнеда, якая разам з Ізяславам выехала ў Полацкую зямлю, была хрысціянкай і ў далейшым пастрыглася ў манахіні пад іменем Анастасія.



**Рэзідэнцыя Рагнеды ў выгнанні — гарадзішча «Замэчак» у Заслаўі. Рэканструкцыя Яўгена Куліка паводле матэрыялаў раскопак Юрыя Зайца (1985 г). Драўляны замак амаль правільнай круглай формы меў у дыяметры 70—74 м, вышыня перашкоды (ад дна рова да грэбня вала) складала 6,5 м.**

У 1000 г. Рагнеда памерла, а праз год пайшоў з жыцця і яе сын Ізяслаў. У полацкага князя засталіся два сыны: Усяслаў і Брачыслаў, але першы памёр у 1003 г. Такім чынам, Полацкая зямля дасталася Брачыславу.

Ад укняжэння Брачыслава пачынаецца перыяд, які доўжыўся больш за сто гадоў і скончыўся высылкай полацкіх князёў у Канстанцінопаль. Галоўны змест гэтага перыяду ў дачыненнях Полацка з Кіевам летапісец ахарактарызаваў кароткай фразай: «меч уздымаюць Рагвалодавы ўнукі супраць Яраслававых унукаў».

## Ці быў Яраслаў Мудры сынам Рагнеды?

Каб лепш зразумець напружанасць далейшых падзей вакол Полацка і Кіева, трэба закрануць яшчэ адно пытанне, якое мае непасрэднае дачыненне да жыцця Рагнеды — колькі ж у яе было дзяцей?

Летапісы наўпрост сцвярджаюць, што ў Рагнеды з Уладзімірам было чатыры сыны і дзве дачкі: Ізяслаў, Яраслаў, Усевалад, Мсціслаў, Прадслава і Праміслава. У даследчыкаў узнікалі і сумневы адносна гэтага спісу — ёсць супярэчнасці ў пераліках Уладзіміравых жонак і, адпаведна, дзяцей у розных летапісах. Асаблівую дыскусію выклікала прылічэнне да сыноў Рагнеды Яраслава — будучага Яраслава Мудрага. Услед за расійска-ўкраінскім гісторыкам XIX ст. Мікалаем Кастамаравым некаторыя даследчыкі ўказвалі, што ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 1054 годам зафіксаваная смерць Яраслава, вялікага князя рускага, які «пражыў 70 і 6 гадоў». У такім разе, Яраслаў мусіў быў нарадзіцца ў 978 г., гэта значыць яшчэ да гвалтоўнага шлюбу Уладзіміра і Рагнеды.

У гістарычнай літаратуры пашыраны стэрэатып, нібыта высылка Рагнеды з Ізяславам у Заслаўе была аднаўленнем незалежнасці Полацка.

Датаванне ў рускіх летапісах — справа вельмі заблытаная. Цяпер існуе па-свойму абгрунтаваная версія, што полацкія падзеі (забойства Рагвалода і паланенне Рагнеды) адбыліся менавіта ў 978, а не ў 980 г. Але і гэтае дапушчэнне не здымае пытання пра маці Яраслава. Вось жа паводле іншых летапісных паведамленняў (Радзівілаўскага летапісу), Яраслаў нарадзіўся ў 988 альбо 989 г.

Вынікі ж антрапалагічных даследаванняў костак Яраслава Мудрага з ягонага саркафага ў Кіеўскай Сафіі сведчаць, што на момант смерці Яраславу было трохі за пяцьдзясят, адпаведна часам яго народзінаў названы перыяд паміж 983 і 986 гг.

Такім чынам, Яраслаў цалкам мог быць сынам Рагнеды. Але адкуль тады ўзялася летапісная тэндэнцыя рабіць яго старэйшым за сапраўдны ўзрост? Цяпер гісторыкі мяркуюць, што такім спосабам перапісчыкі і рэдактары летапісаў імкнуліся зрабіць Яраслава старэйшым за іншага сына Уладзіміра, Святаполка, абгрунтаваўшы правы Яраслава на вялікае княжанне. А Ізяслаў Полацкі пасля эпізоду заступніцтва за Рагнеду выпаў з кола прэтэндэнтаў на кіеўскі трон.

Што ж выходзіць — і Ізяслаў



**Вялікі князь кіеўскі Яраслаў Мудры. Рэканструкцыя акадэміка Міхаіла Герасімава паводле чэрапа, знойдзенага ў саркафагу ў Кіеўскай Сафіі (1939 г.). Вывучэнне шкілета паказала, што вялікі князь меў досыць высокі для XI ст. рост (172 см) ды моцна кульгаў на правую нагу, што цалкам стасуецца з паведамленнямі летапісаў.**

Полацкі, і Яраслаў Мудры мелі бацькамі Уладзіміра і Рагнеду ды з’яўляліся нашчадкамі абедзвюх антаганістычных традыцый. Але іх нашчадкі, у сваю чаргу, будуць разведзеныя зусім радыкальна ды стануць «Рагвалодавымі ўнукамі» (Полацкая галіна) і «Яраслававымі ўнукамі» (Кіеўская вялікакняская галіна). Пазнака «Рагвалодавы ўнукі» вядомая толькі з летапіснага падання пра Рагнеду. Па-за межамі Полацкай зямлі нашчадкаў Рагвалода ў Полацку называлі паводле імя яшчэ аднаго выбітнага прадстаўніка гэтага роду Усяслававічамі. Дзмітры Ліхачоў так і пісаў, што «Рагвалодавымі ўнукамі» лічылі сябе самі полацкія князі.

Паданне пра Рагнеду было менавіта родавым паданнем. Мяркуецца, што яно было прынесенае ў Кіеў з Заслаўя альбо Менска. Паводле даследчыка Барыса Рыбакова, паданне было запісанае баярынам Пятром Барыславічам — летапісцам кіеўскага князя Ізяслава Мсціслававіча, які браў удзел у аблозе Ізяслава (Заслаўя) падчас выправы на Полацк у 1127 г.

Родавыя паданні, безумоўна, перадаюць эмацыйнасць асабістых дачыненняў і супярэчнасцяў паміж княскімі дынастыямі Рурыкавічаў і Рагвалодавічаў. Пры тым што полацкія князі былі Рагвалодавічамі менавіта «па кудзелі», па жаночай лініі — ад Рагнеды. «Па мячы», па мужчынскай лініі, усе гэтыя князі былі нашчадкамі Уладзіміра, які вёў свой радавод ад Рурыка.

Тут мы маем цікавы прыклад выбудовы розных радаводных традыцый. Каб у родавых характарыстыках адлюстраваць антаганізм Полацка і астатняй Русі, была выведзена генеалагічная лінія полацкіх князёў ад Рагвалода. Фіксацыя існавання «Рагвалодавых унукаў» у сістэме тагачаснай улады дазваляла людзям той эпохі мець легітымнае абгрунтаванне даўняга канфлікту.

У той час як кіеўскі стол (трон) займалі прадстаўнікі розных ліній нашчадкаў Уладзіміра, Рагвалодавічы (ці Ізяславічы) абмяжоўваліся Полацкай зямлёй. Пры падзелах Русі паміж князямі, што часта адбывалася ў дамангольскі перыяд, Рагвалодавічы па-ранейшаму застаюцца ўбаку і ім нічога не дастаецца ад тых зямель.

Пра драматычныя абставіны прыняцця хрысціянства і пра рабства як гаспадарчы ўклад Русі чытайце ў наступных выпусках «Гісторыі Беларусі»



# Віталь Гуркоў: «Беларусы маюць выключны байцоўскі ген»

«Быць беларусам — што гэта значыць?» — адказвае чэмпіён свету па тайскім боксе.

Кампанія «Будзьма» і партал Tut.by працягваюць праект, у якім вядомыя ў сваіх сферах дзейнасці людзі расказваюць, што для іх значыць быць беларусам. Чарговым на пытанні анкеты «Быць беларусам — што гэта значыць?» адказаў Віталь Гуркоў — шматразовы чэмпіён свету па тайскім боксе. Сёлета ён стаў найлепшым байцом K-1 ва Усходняй Еўропе.

**— Быць беларусам — што гэта значыць? Якое значэнне Вы ўкладаеце ў слова беларус/беларуска?**

— Беларус — той, у каго сямейныя карані тэрытарыяльна звязаны з нашай зямлёй.

Нават калі чалавек будзе крычаць, што ён рускі, ён усё адно — беларус, хоць і са згубленай самасвядомасцю. Гісторыя размыта, людзі ёй не цікавяцца, таму і «губляюцца».

Быць беларусам, нармальным, сёння — гэта адраджаць гісторыю, мову, нешта рабіць для Беларусі.

Напрыклад, зборная па тайландскім боксе — гэта беларусы. Мы ездзім па свеце, часта перамагаем, крычым «Беларусь!», апрануўшы нашы «боршч»-касцюмы (яны чырвона-зялёна-белыя, як боршч са смятанай). І многія даведваюцца, што на зямлі ёсць такая тэрыторыя.

**— Якія ўнікальныя беларускія рысы характару і светапогляду ўласцівыя беларусам?**

— На жаль, наша ўнікальная рыса — аморфнасць і абыякавасць да сваёй культуры, мовы і гісторыі. Сапраўды ў свеце мала народаў, якія гэтак жа, як беларусы, свядома топчуць тое, чым павінны ганарыцца.

**— Назавіце тры/пяць асноўных падзеяў з гісторыі Беларусі, без ведання якіх — беларус не беларус.**

— 1. Пераклад Бібліі на беларускую мову Францішкам Скарынам. Гэты знакаміты беларускі дзеяч, дарэчы, даў нашаму народу настаўленне ў кнізе «Юдзіф» пра тое, што перш за ўсё трэба любіць сваю зямлю і сваю мову.

2. Грунвальдская бітва, у якой наша войска (Вялікага Княства Літоўскага) сумесна з палякамі ў 1410 годзе разбіла крыжакоў (самае небяспечнае войска на той час).

3. Кар'ера нашага военачальніка Канстанціна Астрожскага, які пад Оршай разбіў утрая большае маскоўскае войска ў 1514 годзе.

4. Падзелы Рэчы Паспалітай. Гэта дзяржаўнае ўтварэнне складалася з дзвюх частак і з'яўлялася канфедэрацыяй Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага (гістарычная назва Беларусі). У 1795 годзе краіну падзялілі. Землі Вялікага Княства адышлі да Расіі, што нанесла па нашай гераічнай гісторыі асноўны ідэалагічны ўдар.

5. Вялікая Айчынная вайна. У гэтай самай крывавай вайне ў гісторыі чалавецтва найбольш пацярпела наша зямля. Танкі з Беларусі не злазілі. І, нягледзячы на гэта, мы вытрымалі і сёння маем патэнцыял і рэзерв абараняць сваю незалежнасць і ўзмацняцца.

Мы менш за ўсіх выкабеньваемся.

**— Якія традыцыі павінен ведаць і захоўваць беларус?**

— Беларусы павінны паважаць і хрысціянскія, і народныя традыцыі (напрыклад, Купалле). У мяне перад вачыма прыклад — краіна Мексіка. Там хрысціянства і нейкія старажытныя традыцыі і веравызнанні спляліся ў гарманічны сімбіёз. Поўная талерантнасць да СВАЙГО.

**— Беларус без ведання беларускай мовы ці беларус?**

— На жаль, гісторыя развярнулася так, што не кожны беларус гэтым цікавіцца — наступствы апалячвання, русіфікацыі. І што цяпер, не лічыць яго беларусам? Вядома, думаючы чалавек павінен разумець — хто ён, адкуль, якую мову ён павінен ужываць, вывучаць, паважаць.

**— Чым беларускім Вы ганарыцеся?**

— Бульбай, чыпсамі, гарэлкай «Бульбаш», хакеем, трактарамі і пераможцамі Дажынак:). А калі сур'ёзна, ганаруся гістарычнымі падзеямі, пра якія ўзгадаў вышэй. І тым, што беларусы патэнцыйна маюць выключны байцоўскі ген, які, праўда, трэба абуджаць.

**— Што робіць беларусаў адметнымі сярод суседзяў?**

— Калі каротка, менш за ўсіх выкабеньваемся.

**— Што робіць беларусаў адметнымі ва ўсім свеце?**

— Агромністая колькасць людзей, якая істотна паўплывала на сусветную гісторыю, — ураджэнцы Беларусі. Першы і сённяшні прэзідэнты Ізраіля (Вейцман і Перэс), шматлікія нобелеўскія лаўрэаты, стваральнікі амерыканскай мафіі (кекс з-пад Бабруйска), нацыянальны герой Чылі (Ігнат Дамейка), род Радзівілаў і гэтак далей...

**— Як Вы бачыце будучыню Беларусі?**

— Цяжкае пытанне.

Хацеў бы бачыць свабодны, самадастатковы народ, які мае гонар, які б паважалі ва ўсім свеце.

НА МУЖЧЫНСКІ РОЗУМ

## Якой павінна быць ідэальная жанчына?

Ведае, чаго хоча ад жыцця. Мужчыны лічаць, што ідэальная жанчына можа пра сябе паклапаціцца, у яе ёсць уласны стыль. Ёй падабаюцца вандроўкі і прыгоды. Яна атрымлівае асалоду ад кожнага імгнення — добрага дэсерту, шпацыра ў парку ці адпачынку на пляжы. Мужчыны мараць пра жанчыну, якая не робіць са свайго каханага сэнс жыцця і не чакае мужчыну, каб пачаць жыць самой.

Ніколі не павінна рабіць першы крок. Лепш пачакаць і незаўважна даць зразумець мужчыну, што яна чакае ад яго запрашэння на спатканне. Чаму? Калі жанчына зробіць першы крок сама, яна ніколі не будзе ведаць, цікавіць яна мужчыну альбо ён проста скарыстаўся магчымасцю.

Сэксуальная і ведае меру сваёй сэксуальнасці. На пачатку рамана жанчына можа адпускаць рэплікі з сэксуальным падтэкстам, фліртуючы, яна абяцае мужчыну радасць асалоды. У разгары рамана ідэальная жанчына ўжо не саромеецца быць адкрытай.

Ведае, калі надыходзіць патрэбны момант. Сэкс — важная частка адносінаў пары. Калі сэкс адбываецца занадта рана, то гэта негатыўна ўплывае на адносіны, абмяжоўваючы іх межамі пасцелі, што ў найбліжэйшай будучыні падштурхне мужчыну да разрыву. Ідэальная жанчына ведае, што трэба даць мужчыну «саспець».

Умее паказаць, што мужчына ёй неабыякавы. Ідэальная жанчына ўмее рабіць нечаканыя падарункі свайму мужчыну. Можа прыгатаваць яго любімую страву, дае яму зразумець, што прыслухоўваецца да яго і да яго патрэбаў.

Не цісне. Мужчыны не выносяць ніякага ціску. Ідэальная жанчына не назвоньвае, не засыпае яго смскамі і электроннымі пасланнямі і не задае лішніх пытанняў аб будучыні. Мужчыны аддаюць перавагу адносінам, якія развіваюцца самі па сабе, без якога-небудзь кантролю.

Ведае, што каханне перадусім. Ідэальная жанчына адчувае сябе шчаслівай са сваім мужчынам, ён для яе важны настолькі ж, наколькі яна для яго.

**Сцяпан Батура**

ЗДАРОЎЕ

## Цалавацца не нацалавацца!

Чаму гэта карысна.



Амерыканскія навукоўцы лічаць, што пацалунак з'яўляецца добрай прафілактыкай для імунітэту: дзякуючы яму людзі абменьваюцца бактэрыямі. Іх не настолькі многа, каб заразіць партнёра інфекцыяй, але дастаткова для выпрацоўкі антыцелаў.

Калі раніцай вы падорыце каханаму чалавеку тры пацалункі, прыкладна па трыццаць секунд кожны, лічыце, што добры настрой, насычэнне мозгу кіслародам для актыўнай разумовай дзейнасці і абарона скуры ад маршчынаў вам забяспечаныя.

**КаМ**

КОЛЫ

## Як выбраць зімовыя шыны

Набліжаецца зіма, пара падумаць пра бяспеку.

### З шыпамі ці без?

На галалёдзе шыпы даюць большы каэфіцыент счаплення з дарогай. Асабліва калі маюць прастакутнае сячэннне і размешчаныя хаатычна, а не роўнымі шэрагамі. Калі купіце шыпаваную гуму, не забывайце наляпіць на аўто знак «Ш» — іншыя кіроўцы будуць мець на ўвазе, што ў вас карацейшы тармазны шлях.

У вялікім горадзе, дзе дарогі чысцяць, варта браць нешыпаваныя. Шыпы будуць малаэфектыўныя на асфальце, пагаршаецца кіраванасць, яны гудуць падчас руху.

### Які малюнак пратэктара?

У глыбокім снезе найбольш эфектыўны — прастакутныя шашачкі, размешчаныя ў шахматным парадку. Счапленне з дарогай узмацняе і наяўнасць дробных палосак (ламеляў) на пратэктары.

Вельмі эфектыўны асіметрычны малюнак: вонкавая частка шыны адказвае за рух па асфальтавым пакрыцці, унутраная — за рух па заснежаным. На мокрым снезе лепей слухаецца аўтамабіль, «абуты» ў гуму з накіраваным малюнкам пратэктара (нагадвае ялінку), які спрыяе адводу снегавой юшкі з-пад колаў.

### Калі мяняць?

Многія «абуваюць» свой аўтамабіль толькі пасля з'яўлення галалёду. Але на першых некалькіх сотнях кіламетраў рэкамендуецца абкатка без рэзкіх тармажэнняў, з плаўнымі разгонамі і акуратнымі ўваходамі ў паварот.

Зімовыя шыны ў сярэднім служаць 2—4 сезоны. Калі глыбіня пратэктара робіцца меншай за 4 мм — час набываць новыя.

### Калі паставіць толькі дзве

зімовыя шыны на вядучыя колы, у паводзінах аўтамабіля могуць паўстаць непрыемныя моманты. У экстранай сітуацыі аўто можа горай слухацца руля на паваротах, ісці юзам падчас тармажэння.

**Сяргей Мікулевіч**



**Шыны з асіметрычным малюнкам.**

РАДАВОД

## На Віцебшчыне жылі вікінгі

Археолагі знайшлі на поўначы Беларусі парэшткі паселішча вікінгаў. Доктар гістарычных навук Вольга Ляўко не ўдакладніла, дзе менавіта, каб не празналі «чорныя капальнікі». Археолагам трапіліся злíткі каляровых металаў, сярэбраны наканечнік похваў мяча, матрыца для адліўкі паясных наканечнікаў і прадметы побыту, якія сведчаць, што вікінгі ў тым месцы не спыняліся на шляху «з варагаў у грэкі», а стала жылі. Таксама знайшлі магілу ваяра-вікінга. Ён быў пахаваны разам са зброяй і канём. Як можна меркаваць, паселішчы вікінгаў у Беларусі былі невялікімі і размяшчаліся недалёка ад паселішчаў мясцовых жыхароў.

**БЕЛТА**




**Прэм'ера «Масакры»**

Першы фільм новай эры беларускага кіно пакажуць **7 лістапада**, у межах кінафестывалю «Лістапад» **(Дом кіно (Талбухіна, 18), 17.00)**, а **11 лістапада** пройдзе нацыянальная прэм'ера фільма. Увага: дзецям да 16 гадоў уваход забаронены.

## ФУТБОЛ

**БАТЭ — «Шэрыф»**

**4 лістапада на стадыёне «Дынама»** пройдзе матч чацвёртага тура групавога этапу Лігі Еўропы. Барысаўскі **БАТЭ** прыме цірaспальскі **«Шэрыф»**. У першай гульні гэтых каманд з мінімальным лікам перамог БАТЭ — 1:0. **Пачатак у 20:00.** Білеты каштуюць ад 10 да 30 тысяч рублёў. Касы ў Мінску працуюць да 19-й. Калі ўсё складзецца добра, то ў выпадку перамогі БАТЭ можа забяспечыць сабе датэрміновы выхад у наступны раўнд.

**Беларуская класіка**

А **7 лістапада ў Барысаве БАТЭ** памераецца сіламі з мінскім **«Дынама»** ў межах першынства краіны. Хоць сталічная каманда і страціла шанцы стаць чэмпіёнамі, але гульні заўсёды носяць прынцыповы характар. Гэта як «Барселона» — «Рэал» у Іспаніі. Наша, беларуская класіка.

## МУЗЫКА

**Развітальны канцэрт А-НА**

**6 лістапада ў Палацы спорту (пр.Пераможцаў, 4)** адбудзецца развітальны канцэрт нарвежскага гурта А-НА. **Пачатак а 20-й.**

**Лявон Вольскі & Ко**

**8 лістапада** — канцэрт **у клубе «Графіці» (зав.Калініна, 16). Пачатак а 19-й.**

**Алесь Камоцкі з найлепшым**

Праграма складзеная па замовах найбольш актыўных прыхільнікаў з песняў, што ўвайшлі ў апошнія альбомы Алеся Камоцкага — «Дах», «З бацькоўскай кружэлкі» і «9», а таксама новага, яшчэ не выдадзенага альбома. **8 лістапада, Тэатр беларускай драматургіі (вул.Крапоткіна, 44). Пачатак а 19-й.**

**Метал у «Рэактары»**

**3 лістапада ў клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29) а 18-й** — канцэрт **Sabaton** (Швецыя), **Alestorm** (Шатландыя), **Steelwing** (Швецыя). Спецыяльны госць — **Litvintroll**.

**«Без білета»**

Сольны канцэрт гурта ў Дзень безбілетніка. **7 лістапада, Вялікая зала КЗ «Мінск» (вул.Кастрычніцкая, 5). Пачатак а 19-й.**

**Ісландскі гурт Mezzoforte**

**10 лістапада а 19-й у Вялікай зале КЗ «Мінск»** — канцэрт гурта Mezzoforte. Гэта ісландскі калектыў, які грае мікс з фанка, джаз-року і ф'южн.




## ВЫСТАВЫ

**Выстава твораў Барыса Заборава**

**Да 10 снежня ў Мастацкім музеі (вул.Леніна, 20)** выстаўленыя 38 твораў жывапісу і скульптуры Барыса Заборава. Мастак нарадзіўся ў Мінску ў 1935-м, ад 1981 ён жыве ў Парыжы. Яго называюць беларускім мастаком, а сам Забораў лічыць сябе грамадзянінам сусвету, радзіма якога — Беларусь.

**Выстава супраць смяротнага пакарання**

**Да 11 снежня ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны** працуе выстава «Смерць — гэта не правасуддзе». Выстава мае на мэце паказаць, што смяротнае пакаранне мусіць быць скасаванае.

**Карціны Юдаля Пэна ў Мінску**

**У Музеі Якуба Коласа да 21 снежня** працуе выстава партрэтаў і краявідаў Юдаля Пэна. У экспазіцыі — 23 працы майстра з калекцыі Віцебскага краязнаўчага музея. Акрамя таго, дэманструюцца 40 паштовак з краявідамі Віцебска пачатку XX стагоддзя.

**Грунвальд**

**Да 21 лістапада ў Палацы мастацтваў (вул.Казлова, 3)** працуе выстава «Грунвальд», прысвечаная 600-годдзю перамогі войскаў ВКЛ і Польшчы над тэўтонцамі.


БАРЫС ЗАБОРАЎ. ХЛОПЧЫК НА РОВАРЫ

## ТЭАТРЫ

**3 лістапада**

**Юнага гледача** — «Вандраванне ў княства Сноў»
**Лялек** — «Пiпі Доўгаяпанчоха»
**Купалаўскі** — «Вячэра з прыдуркам»
**Беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»
**Беларускай драматургіі** — «Дамавічкі»
**Імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Оперы і балета** — «Марная перасцярога»

**4 лістапада**

**Юнага гледача** — «Тры парсючкі»
**Імя Горкага** — «Дзева і смерць»
**Беларускай драматургіі** — «Квакі і квокі»
**Беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Оперы і балета** — «Яўгеній Анегін»

**5 лістапада**

**Лялек** — «Балада пра белую вішню»
**Юнага гледача** — «Прыгоды Бібігона»
**Беларускай драматургіі** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**Беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепш»
**Оперы і балета** — «Чароўная флейта»

**6 лістапада**

**Юнага гледача** — «Бармалей»
**Лялек** — «Васіліса Прыгожая»
**Оперы і балета** — «Чароўная флейта»
**Імя Горкага** — «Каштанка»
**Оперы і балета** — «Шчаўкунок»
**Імя Горкага** — «Васа»

**7 лістапада**

**Лялек** — «Марынка-крапіўніца»

**8 лістапада**

**Купалаўскі** — «Вечар»
**Сучасны мастацкі** — «Над зязюліным гняздом»

**9 лістапада**

**Оперы і балета** — «Князь Ігар»
**Новы** — «Зацюканы апостал»
**Імя Горкага** — «Пане Каханку»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «Механічны чалавек»
**Беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»

**10 лістапада**

**Музычны** — «Мая жонка — ілгуння»
**Моладзевы** — «Кар'ера Чэлестына»
**Оперы і балета** — «Рамэа і Джульета»
**Новы** — «Шалёныя грошы»
**Сучасны мастацкі** — «Радзіна»
**Імя Горкага** — «Жаніх»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «…Забысь Герастрата!»
**Беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»
**Купалаўскі** — «Пінская шляхта»

**11 лістапада**

**Музычны** — «Шахеразада. Іспанскія мініяцюры»
**Моладзевы** — «Калі б я меў залатыя горы…»
**Оперы і балета** — «Вяселле Фігара»
**Новы** — «Тры пары і адзін лёс»
**Імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»
**Тэатр-студыя кінаактора** — «…Забысь Герастрата!»
**Беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Купалаўскі** — «Пінская шляхта»

**12 лістапада**

**Лялек** — «Драй швэстэрн»
**Моладзевы** — «Вясёлы кірмаш»
**Беларускай арміі** — «Вераб'іная ноч»
**Клуб імя Дзяржынскага** — «Камедыя»
**Оперы і балета** — «Карсар»
**Новы** — «Не бойся быць шчаслівым»
**Імя Горкага** — «Эсфір»
**Беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Купалаўскі** — «Не мой»

## КІНО

# «Лістапад» абяцае экстрым

Фестываль «Лістапад» пройдзе ў Мінску ад 5 да 12 лістапада.

У асноўны конкурс уключаныя 12 стужак з краінаў колішняй камуністычнай прасторы. Напрыклад, сербскі фільм **«Святы Георгі забівае цмока»**, кіргізскі **«Выкрадальнік святла»**. Румынская карціна **«Аўрора»** — вельмі запатрабаваная на кінафэстах. Таксама будзе прадстаўленая скандальная карціна **«Шчасце маё»** Сяргея Лазніцы.

У конкурсе маладога кіно — 9 дэбютных фільмаў з Індыі, Перу, Венесуэлы, Іспаніі, Уругвая. У конкурсе таксама будуць прадстаўлены 20 неігравых стужак сталых аўтараў і, асобна, 12 карцінаў маладых дакументалістаў. Адбудзецца паказ стужкі **«Дзюка»** беларускага рэжысёра Андрэя Куціла.

У пазаконкурснай праграме «За пяць хвілін «Оскар» будуць прадстаўленыя аргенцінскія, ізраільскія, японскія і аўстрыйскія стужкі. Сярод іх — сенсацыйныя анімацыя **«Вальс з Башырам»** пра ліванскую вайну.

У праграме «Экстрым і Канаманія» — фільмы з Паўднёвай Карэі і Філіпінаў. Стужкі з гэтага рэгіёна славяцца сваёй жорсткасцю.

Па-за конкурсам «Панарама расейскага кіно». Тут варта назваць **«Аўсянкі»** Аляксея Фядорчанкі і **«Качагар»** Аляксея Балабанава. А актрыса Людміла Гурчанка выступіць у рэжысёрскай ролі з фільмам **«Стракатыя прыцемкі»**.

Чатыры французскія стужкі вылучаныя ў праграму французскага майстар-класа. Сярод фільмаў — карціна **«Прытулак»** Франсуа Азона.

**Андрэй Расінскі**

# Як гэта па-нашаму?



Разбор вала:
1. Głowa. 2. Szyja, na bulion. 3. Góra, na gorszą pieczeń. 4. Łopatka (szponder), na bulion i sztukę mięsa. 5. Goleń, na dodatki. 6. Nogi. 7. Mostek, na sztukę mięsa i bulion. 8. Polędwica. 9. Ogonuwka (krzyżówka) na pieczeń, zrazy i klopsy. 10. Kośliwa, na sztufadę, pieczeń i pekeflejsz. 11. Zrazuwka, dobra na pieczeń, zrazy i sztufadę. 12. Krzyżówka, pierwsza na befsztyk, zrazy i klopsy. 13. Łojówka, na rosół i sztukę mięsa. 14. Rostbef i kotlet, na rumsztyk i entre-cote. 15. Żeberka, na rosół.
Прапанаваны варыянт перакладу:
1. Галава. 2. Шыя, на булён. 3. Верх, на горшую смажаніну. 4. Лапатка, на булён і кавалак мяса. 5. Галёнка, на дадаткі. 6. Ногі. 7. Грудзінка, на кавалак мяса і булён. 8. Паляндвіца. 9. Сцягно, на смажаніну, зразы і клопсы. 10. Мяса для тушэння адным кавалкам, смажаніны і пекефлейшу. 11. Мяса для смажаніны, зразаў і штуфады. 12. Найлепшае мяса для біфштэксу, зразаў і клопсаў. 13. Ялавічына з лоем, на булён і кавалак мяса. 14. Ростбіф і катлета, на рамштэкс і антрэкот. 15. Рабрынка, на булён.

### «Наша Ніва» рыхтуе да друку цікавае і патрэбнае выданне.

Гэта кулінарная кніга нашай зямлячкі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», якая выйшла ў свет у першы раз у Вільні ў 1854 годзе па-польску і з таго часу больш як паўтара дзясятка разоў перавыдавалася — кожны раз па-польску.

І вось зараз гэтая кніга, якую Уладзімір Караткевіч назваў «першай нашай кулінарнай кнігай» і якая, акрамя таго што ўтрымлівае мноства цікавых кулінарных рэцэптаў, дае яскравую карціну жыцця нашых продкаў, неўзабаве мае выйсці ў серыі «Кнігарня «Нашай Нівы».

Некаторыя з рэцэптаў друкаваліся ў «Нашай Ніве» і кожны раз выклікалі дасціпныя і карысныя для перакладчыкаў каментары чытачоў, абазнаных і ў беларускай мове, і ў беларускіх кулінарных традыцыях.

Вось чаму, сутыкнуўшыся з цяжкасцямі перакладу, перакладчыкі, упэўненыя ў філалагічнай і кулінарнай таленавітасці чытачоў «НН», вырашылі менавіта да іх звярнуцца па дапамогу.

Гаворка пра разбор жывёлін. Вядома, што методыка такога разбору ў кожнай краіне свая, гатункі мяса адрозніваюцца па назвах і кулінарнаму выкарыстанню. У кнізе Завадскай разбор таксама спецыфічны. На жаль, менавіта беларускіх назваў гэтых частак тушаў жывёлін мы не ведаем. Польскімі ці расейскімі калькамі карыстацца не хацелася б. Можа, вы памятаеце, як тое ці іншае мяса называлася ў вашай вёсцы ці горадзе? Як тую ці іншую частку называў дзед, калі калоў бычка? Як называлася тое, што ваша бабуля запякала ў печы і што клала ў суп?

Просім чытачоў дапамагчы аднавіць беларускія назвы розных гатункаў мяса.

Пачнём з ялавічыны. На малюнку вы бачыце схему разбора вала, прыведзеную ў кнізе Завадскай. Якія беларускія адпаведнікі польскім назвам гэтага мяса вы прапануеце выкарыстоўваць?

**НБ**

ЗДАРОЎЕ

## Кава: дабро для страўніка, нагрузка для сэрца

Нават пра алкаголь няма такіх спрэчак, як пра каву. А ўсё чаму? Складаны хімічны склад напою абумоўлівае тое, што кава можа ўплываць на арганізм і станоўча, і адмоўна.

### Кава супраць раку

Медыцына прызнае: кава забяспечвае прафілактыку раку ўсіх частак страўніка. Зразумела, кава такіх хваробаў не лечыць, але шанцаў захварэць на іх у каваманаў нашмат меней.

Рак тоўстай кішкі ў людзей, якія выпіваюць па 3-4 кубачкі кавы — з'ява рэдкая. Але 3-4 кубачкі кавы — гэта моцны ўдар па сэрцы.

### Чаго баяцца?

Праціўнікі кавы часта ўзгадваюць Бальзака — самую вядомую ахвяру кавы.

Калі выпіваць у дзень больш за шэсць кубкаў кавы, то верагоднасць зарабіць сабе сардэчнае захворванне ўзрастае на 70%. З другога боку, больш за шэсць кубкаў любога напою ў дзень — гэта дакладна перабор.

Калі каву лепш не піць? Пасля абеду і перад сном. У першым выпадку кава перагружае і без таго нагружаны страўнік, а ў другім — вас чакае бяссонніца.

Калі з сэрцам дрэнна, ад кавы варта адмовіцца, як і ад іншых энергетычных напояў. Зрэдку можна дазволіць сабе кубачак, але «слабай». Тое самае і з гіпертаніяй.

Карацей, 1-2 кубкі кавы ў дзень — гэта нават карысна. А што да «наркотыкаў», дык прывыканне і псіхалагічная залежнасць ад кавы не большая, чым ад шакаладу.

**Юрась Ускоў**

САЛІДАРНАСЦЬ

## Дапамажыце маленькаму Эдуарду

### унуку нябожчыка Вячаслава Дубінкі — аднаго з удзельнікаў незалежніцкага руху 1970–1990-х.

Эдуарду ўсяго 2 гады, і яго жыццё — пастаянная барацьба за сваю будучыню. Дыягназ — дзіцячы цэрэбральны параліч цяжкай формы, эпілепсія. Рэабілітацыйныя цэнтры Беларусі і Расіі не прымаюць малога праз сутаргі. Але бацькі не здаліся, знайшлі Інстытут Глена Домана ў Філадэльфіі, дзе не адмаўляюцца нават ад самых цяжкіх дзяцей. У красавіку 2010 дзякуючы дапамозе неабыякавых людзей было сабрана 7 500 даляраў, і малы атрымаў магчымасць паехаць у ЗША. Вынікі проста цудоўныя — дзіця пачало бачыць, усміхацца, прамаўляць гукі. У яго наладзілася страваванне і пачалі знікаць сутаргі. І самае галоўнае — у маленькага Эдзіка стала паволі атрымлівацца паўзці.

Чарговая паездка запланаваная на 8 снежня. І, на жаль, бацькі зноў вымушаныя прасіць дапамогі. Калі ласка, не праходзьце міма! Калі вы можаце ахвяраваць хлопчыку ўсяго 10 000 рублёў, то ўявіце, калі гэта зробяць 1 000 чалавек…

Дапамагчы можна, пералічыўшы сродкі на дабрачынны рахунак, адкрыты ў філіяле № 514 у АСБ «Беларусбанк», УНП 100420097; МФО 153001614.

У беларускіх рублях — № 000000008

(Транзітны рахунак № 3819382102369 пры пералічэнні сродкаў юрасобай)

У далярах ЗША — № 8400000000112

(Транзітны рахунак № 3819382109779 пры пералічэнні сродкаў юрасобай)

Прызначэнне плацяжу: На Дубінка Вольгу Вячаславаўну для лячэння сына Базанава Эдуарда.

Рахункі для міжнароднага перавода:
У далярах ЗША:
56 Correspondent bank: SCBLUS33
STANDARD CHARTERED BANK, NEW YORK
57 Beneficiary bank:
SWIFT Code: AKBBBY2X
Chips UID: 319438
JSSB BELARUSBANK
32, MYASNIKOVA STREET
MINSK 220050, BELARUS
59 Beneficiary:
/Acc. No. /8400010000610
Name: Olga Dubinko
REMITTANCE INFORMATION
70/ Privat Transfer
ACC at BR 514

Для паштовых пераводаў:
Атрымальнік: Дубінка Вольга Вячаславаўна
Пашпарт МР 2051911 выдадзены Савецкім РУУС г. Мінска
Адрас: г. Мінск, вул. Кунцаўшчына, 15—15
З павагай і бясконцай удзячнасцю,
Вольга, Павел і маленькі Эдуард.

Больш — на сайце dcp.by


## Прыватныя абвесткі

**АНТЫКВАРЫЯТ**

**Прадаю** адрэстаўраваны прас на вуголлі. Для працы ды інтэр'еру. Т.: (033) 634–32–01.

**ЖЫТЛО**

**Валька і Міхась здымуць** кватэру. Т.: (029) 690–92–56.

**Мяняю 1-пакаёвую кватэру** (17/30 кв.м., 4 паверх) у цэнтры Віцебска на любое жытло ў Мінску, можна непрыватызаванае. Т.: (029) 947–62–63.

**КНІГІ, МУЗЫКА**

**Прадам кнігі па гісторыі Беларусі**, мастацкія пераклады, альбомы па мастацтве. Грамадзяне! Час зрабіць правільны выбар. Для беларускамоўных падчас куплі мяркуюцца істотныя зніжкі. Т.: 288–05–44, (029) 185–66–06.

**Куплю** кнігу: Эліза Ажэшка «Выбраныя творы». Т.: (029) 195–90–65. Алесь.

**Выйшла кніга «страдацельных» песень «Жорсткі раманс»** (недаследаваны жанр у беларускай фальклярыстыцы). 435 старонак. Жадаючым набыць: (029) 672–03–75.

**ПАШЫЎ**

**Дапамагу** ў стварэнні паўсядзённай і святочнай вопраткі. Т.: (029) 353–73–06. Наталля.

**ПРАЦА**

**Беларускамоўная дзяўчына шукае беларускамоўную працу!** Пра сябе: вышэйшая лінгвістычная адукацыя (нямецкая, англійская, троху французская і польская), досвед працы тры гады ў якасці перакладчыка і сакратара. Т.: (029) 778–68–36. Зацікаўленым дашлю рэзюмэ.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!


## Кемікі



1) На агародзе сабрана 8 гарбузоў вагой 1 кг, 2 кг, 3 кг, 4 кг, 5 кг, 6 кг, 7 кг, 8 кг. Дачніца з сабою мае 4 мяшкі. Як раскласці гарбузы, каб вага кожнай ношы была аднолькавай?

2) За 5 гадоў Лена будзе ўдвая старэйшай, чым цяпер. Колькі гадоў Лене цяпер?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**

Сапраўдная беларуская кухня

# Сезон карпа

### Карп у піве

**1 карп, 50 г масла, 2 цыбуліны, 1—2 корані пятрушкі, 2 морквы, 1 ч. лыжка мёду, соль, спецыі па смаку, 1—2 шклянкі светлага піва.**

Падрыхтаванага карпа нарэзаць сярэднімі кавалкамі. У неглыбокую каструлю, змазаную маслам, пакласці кавалкі рыбы, адвольна нарэзаную гародніну, дадаць спецыі (можна скарыстацца гатовай сумессю вострых прыправаў для рыбы) і разведзены ў вадзе мёд. Усё заліць півам. Давесці сумесь да кіпення і варыць 6—8 хвілін. Затым зменшыць агонь і варыць да гатоўнасці рыбы. Гатовую рыбу пакласці на талерку, гарніраваць адварной гароднінай, упрыгожыць зелянінай. Булён, у якім варылася рыба, працадзіць і падаць як соус.

### Карп запечаны

**1 карп, 2 цыбуліны, 2 ст. лыжкі масла, ½ лімона, зеляніна пятрушкі, соль, молаты перац да густу.**

Свежую рыбу ачысціць і выпатрашыць за дзень да запякання.

Злёгку пасаліць, пасыпаць перцам, пакрапіць лімонным сокам, пасыпаць дробна нарэзанай цыбуляй. Паставіць у добра разагрэтую духоўку за 30 хвілін да падачы на стол. Падчас запякання перыядычна паліваць рыбу сокам, які ўтвараецца пры запяканні. Па меры выпарэння вадкасці дадаваць гарачую ваду.

Гатовую рыбу пасыпаць дробна сечанай зелянінай пятрушкі. На гарнір падаць адварную або смажаную бульбу, ліставую салату.

Каб надаць рыбе больш пікантны смак, можна падрыхтаванага апісаным вышэй спосабам карпа нацерці перад запяканнем растоўчаным з соллю часнаком (2—3 долькамі) і пакінуць яго ў халадзільніку на 30 хвілін, а пры запяканні ўліць на бляху ½ шклянкі белага сухога віна і 2 ст. лыжкі алею, а таксама дадаць 1 ст. лыжку тамату-пюрэ, лаўровы ліст і некалькі гарошын духмянага перцу.

### Карп з хрэнам і яблыкамі

**1 карп, 2 ст. лыжкі 3%-га воцату, 1 цыбуліна, пятрушка, сельдэрэй, соль, чорны і чырвоны молаты перац, лаўровы ліст да густу. Для соусу: 130 г хрэну, 1—2 яблыкі, 1/3 шклянкі 3%-га воцату, 1/3 шклянкі рыбнага булёну, цукар па смаку.**

Падрыхтаванага і нарэзанага парцыённымі кавалкамі карпа паліць слабым растворам воцату. Пятрушку, сельдэрэй, цыбулю праварыць у вадзе або булёне з дадаткам перцу і лаўровага ліста. Рыбу заліць працэджаным булёнам і варыць да гатоўнасці.

Для соусу хрэн нацерці на тарцы, злучыць з цёртымі кіслымі яблыкамі, дадаць цукар, воцат і рыбны булён.

Перад падачай паліць соусам рыбу або падаць соус асобна.

**НБ**




**Ну і хто тут пераможца? У Санья (Кітай) прайшоў конкурс прыгажосці «Міс свету». Выбралі амерыканку Александрыю Мілз (плача). Нашу краіну там прэзентавала Людміла Якімовіч з Гродна (смяецца).**

# «Нейра Дзюбель»: «Такога панкаўскага дыска ў нас яшчэ не было»

## Завяршыўся запіс новага альбома гурта.

Ён атрымаў назву «Афтары праўды». 26 кастрычніка дырэктар студыі гуказапісу «Осмас» Павел Юрцэвіч перадаў лідару «Дзюбеляў» Аляксандру Кулінковічу канчатковую версію запісу.

«Мы пачалі запіс у лютым, скончылі толькі зараз. Але ўсё адно хутчэй, чым у выпадку з папярэднім альбомам гэтага калектыву — «Штазі». Працай з музыкамі «Нейра Дзюбеля» ўсе засталіся задаволеныя. Будзем рады яе працягнуць у будучыні», — кажа спадар Юрцэвіч.

Лідар гурта «Нейра Дзюбель» Аляксандр Кулінковіч так апісвае свой новы альбом:

«Такога вясёлага і па-сапраўднаму панкаўскага дыска ў нас яшчэ не было ніколі. Гэта сапраўдны безгаловы і энергічны панк.

Так мы ніколі не гралі. Калі пачыналі працу над альбомам, то думалі яго назваць па-сур'ёзнаму — «Аўтары праўды». Але потым зразумелі, што ён будзе і сур'ёзным, і несур'ёзным адначасова, зусім як жыццё. Таму і абралі такую не зусім сур'ёзную назву — «Афтары праўды». Яна без нейкіх прэтэнзій. Проста неяк глянулася нам».




Новы альбом «Нейра Дзюбеля» змяшчае 15 новых песняў, 4 лірычныя адступленні і два бонусы — новая версія старога твора «Машыны» і беларускамоўная версія песні «Ленін».

«Афтары праўды» атрымаліся менш беларускамоўным альбомам, чым папярэднія «Штазі» і «Танкі». Там толькі тры песні на мове. «Проста мне зараз так думаецца, так пісаліся гэтыя песні.

Я не магу пісаць са слоўнікам. Ведаю, што гэта робяць шмат якія музыкі. Лічу, што так рабіць не зусім шчыра», —зазначае Аляксандр Кулінковіч.

**Алесь Пілецкі**

Набыць дыск «Афтары праўды» можна будзе на прэзентацыі, якая адбудзецца **11 лістапада ў мінскім клубе «Рэактар» (Харужай, 29а)**. **Пачатак а 19-й.** Цана квіткоў — 35—60 тысяч руб.




**Ты з Паўднёвай, я з Паўночнай... Сустрэча сваякоў-карэйцаў, якія пасля вайны 1950—1953 былі падзеленыя дзяржаўнай мяжой. Такіх сустрэч ад 2000 г. прайшло ўсяго 17, а раней увогуле не было.**

**Біёлаг Зміцер Шамовіч, што працуе ў заказніку Красны Бор на поўначы Віцебшчыны, падбірае ў лесе ваўчанятаў, што засталіся без бацькоў, і выхоўвае на сваім хутары.**



## Анекдоты

***

— Чуеш, сусед, а чаго гэта твой певень учора ўвечары роў у курніку не сваім голасам?
— А гэта я яго на зімовы час пераводзіў.

***

Арганічная хімія — гэта хімія злучэнняў вугляроду.
Біяхімія — гэта вывучэнне злучэнняў вугляроду, якія поўзаюць.

***

Мужчына сталага веку прыходзіць у аддзел кадраў фірмы. Кадравік:
— На жаль, вы нам не падыходзіце. Нам трэба людзі маладыя, амбітныя, здольныя творча расці!
— І ўсё-такі запішыце мой тэлефон. Калі высветліцца, што ў вас усе творча растуць, а працаваць няма каму — патэлефануйце.

***

Шостая гадзіна раніцы. У кругласутачную кветкавую крамку заходзіць інтэлігентнага выгляду мужчына з відавочнымі прыкметамі бурлівай ночы на твары.
— Спадарыня, падбярыце мне букет для жонкі. Прыгожы.
Потым, падумаўшы, дадае:
— І мяккі.

***

— Паглядзі, любая, колькі я сёння рыбы налавіў!
— Ага, так я і паверыла! Суседка бачыла, як ты заходзіў у рыбны магазін!
— Ну... Частку ўлову давялося, вядома, прадаць...

***

Чым цывільны сабака адрозніваецца ад службовага?
Калі цывільнаму сабаку няма чаго рабіць, ён спіць у будцы.
Калі службоваму сабаку няма чаго рабіць, ён гэтую будку фарбуе.

***

Калі архітэктура — гэта музыка ў камені, тады многія будынкі — сабачы вальс.

## «НН» сто гадоў з вамі

Віленская судовая палата асудзіла на вечнае пасяленне [у Сібір] старога бацьку і двух сыноўстудэнтаў Умястоўскіх за належнасць да Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

**«НН». № 42. 1910**

У пятніцу на «беларускай Галгофе» — на версе курапацкай гары — паставілі два крыжы, якія завяршылі мастацкую кампазіцыю «Крыжы памяці». У ёй адзін крыж — рыма-каталіцкі, другі — праваслаўны і трэці — уніяцкі. Да Дзядоў крыжоў у Курапатах ужо стаяла 20: жалезныя, драўляныя, вялізныя ды малыя.

**«НН». № 44.2000**

**Адказы да старонкі 15:**
1) 1+8, 3+6, 2+7, 4+5; 2) 5 гадоў.

**Наша Ніва**
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6425.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 02.11.2010.
Замова № 5332.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614